Новы час | 25 жніўня 2017 | № 31 (545) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 8

Літаратурная Беларусь

Выпуск №8 (132)
(жнівень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»


lit-bel.org
novychas.by

Змест

НАВІНЫ: падзеі грамадска-літаратурнага жыцця Беларусі .... с. 2
СЯБРОЎСТВА: перастварэнне новых вершаў балгарскага паэта і сябра Беларусі Найдана ВЫЛЧАВА Анатолем ВЯРЦІНСКІМ і пераклад фрагмента рамана Тадэвуша МІЦІНЬСКАГА Ірыны ХАДАРЭНКА .... с. 3
ПРОЗА: «Шчонаўскія абразкі» Альжбеты КЕДА .... с. 4
ПАЭЗІЯ: новыя вершы Іны СНАРСКАЙ .... с. 5
ЧЫТАЛЬНЯ: фрагменты аповесці Лявона ВАЛАСЮКА «Пляц» .... с. 6–7
ПАЭЗІЯ: «Кракаўскі ровар» Андрэя ХАДАНОВІЧА .... с. 8
ПРОЗА: Адам ГЛОБУС пра мастака і сваяка Анатоля АЛЕКСАНДРОВІЧА .... с. 9
ЭСЭ: Андрэй ФЕДАРЭНКА пра Івана ПТАШНІКАВА .... с. 10–11
СВЕТ: асноўныя падзеі і цікавосткі замежнага літпрацэсу .... с. 12

Пад сонцам найвышэйшай пробы

(Стагоддзе Народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля)



Даўно не пакідае мяне пытанне, можа быць, нават загадка трывалай звязанасці Янкі Брыля і Міхася Стральцова. У адным з тэкстаў Валянціна Акудовіча ёсць прыпамінак пра тое, як Стральцоў намаўляў маладога крытыка напісаць эсэ пра Янку Брыля. «Чаму менавіта пра яго? Хіба якое свята ці юбілей?». «Янка Брыль — гэта заўсёды свята», — быў адказ.

Тут жа і ўспамін Анатоля Кудраўца, як разбіраўся пасля смерці загадчыка аддзела крытыкі часопіса «Нёман» Міхася Стральцова працоўны пісьмовы стол, і ў шуфлядзе знайшлося некалькі выразак, лістоў, рукапіс вершаў і — вялікі фотаздымак Івана Антонавіча, беражліва схаваны ў кардонную тэчку.

Шмат што сыходзіцца ў гэтай звязанасці двух сялетніх юбіляраў, якія абодва — заўсёднае нашае свята. Любоў да слова, а не да тысячы знакаў. Прыманне быцця, хоць і ў глухой, зацятай з ім спрэчцы. Але, мабыць, найперш — штохвіліннае чаканне той успышкі, дзеля якой усё «стала быць». Бо як успышка, эпіфанія, нараджае тэкст, так яна мусіць і нарадзіць чытача, «паяднаць пачатак і канец».

Досвед Янкі Брыля, набрынялы талстоўскай традыцыяй, сведчыць, што здзяйсненне стылістычнай рэвалюцыі магчымае і ў самы неспрыяльны час. Рэч не ў абстрактным «лірызме прозы», а менавіта — у сінтаксісе і рытме, на якіх у літаратуры трымаецца многае:

«Прыгожая была гэта шэрая, вельмі жыццёвая, натуральная прастата, гэтая яшчэ ўсё не растрачаная сіла, якую і не высушылі, і не прыглушылі дзевяць дзясяткаў больш катаржных, чым радасных, гадоў. Прыгожы быў позірк светла-блакітных вачэй пад густымі, сівымі брывамі, вачэй адкрытых і чыстых, як само бясхмарнае неба, паўторанае ў крынічным люстры бяскрайняга возера. Прыгожы быў, урэшце, увесь гэты звычайны, будзённы малюнак: вялікая чорная лодка на вадзяной пустыні, у лодцы — шэры дзед і светленькая ўнучка, а за кармой, на буксіры, — доўгае сасновае бервяно і яшчэ даўжэйшы трохкутнік растрывожанай вады».

Шасцідзясятнікі «філалагічнага пакалення», якія, паводле Міхася Стральцова, зачытваліся «Надпісам на зрубе», дзякуючы Янку Брылю вельмі добра сталі разумець змену пісьменніцкай задачы. Бо цяпер важна было не нашрайбаць вытворчы раман ці франтавую эпапею, а — добра, ужываючы найлепшую еўрапейскую оптыку, выпісаць адзін, другі канкрэтны абзац, скласці з іх трывожна-радаснае, цэльнае апавяданне. Так, як гэта робіць Янка Брыль, кідаючы свой позірк, напрыклад, і на зборышча вясковых катоў, якія чакаюць на беразе прышвартоўкі рыбацкай брыгады:

«Каты — залежна ад узросту — то нецярпліва пахаджалі, задраўшы хвасты, церліся каля гаспадарскіх ног і па-блазенску дакучліва вякалі, то стрымана, салідна аблізваліся, жмурачы лянівыя вочы.

Толькі адзін, найбольш бывалы і вопытны тыграў сваяк, вядомы на ўсю вёску валацуга і злодзей Цярэшка сядзеў воддаль, на зялёным прыгорку, цікуючы і на ваду, і на сушу з аднолькавым скепсісам на вусатым мурле».



Цяпер важна было не нашрайбаць вытворчы раман ці франтавую эпапею, а — добра, ужываючы найлепшую еўрапейскую оптыку, выпісаць адзін, другі канкрэтны абзац, скласці з іх трывожна-радаснае, цэльнае апавяданне. Так, як гэта робіць Янка Брыль

Падобная дэталізацыя, дзякуючы моцнай оптыцы, не магла не прыводзіць да ўскладнення сінтаксісу, але яна і падштурхоўвала аўтара да разумення самакаштоўнасці эпізода, аднаго назірання, у якім знойдзеш і свой сюжэт, архітэктоніку, з амаль невычэрпнай крыніцай аздобаў, і магчымасць ствараць наўзамен дынамічнай, вельмі часта паспешлівай прозы — вітраж разасобленых эцюдаў, па-майстэрску складзеных у адно кампазіцыйнае цэлае: кнігу.

І гэта можа стаць кнігай пра нястрачаны час і пра зафіксаванага на ягоным тле асобнага чалавека. Які выслухаў сотні чужых біяграфій і зрабіў іх часткай сваёй. Які захаваў на крышталіках сотні краявідаў, запомніў водар ручая, акіяну, лесу і горнай вяршыні.

Такой кнігай мне бачыцца «Жменя сонечных промняў» — маленечкі прамакутнік шэсцьдзясят пятага года ў каларытным афармленні Барыса Заборава. Гэта шасцічасткавая ўверцюра, распачатая матывамі чалавечай унікальнасці, рознасці і роўнасці перад сыходам, праведзеная праз аповеды пра кніжнасць і пачутыя трапныя выслоўі, праз медытацыі над з'явамі прыроды і карнавальныя арабескі жартаў — да запісаў пра дзяцей, у чыіх вачах бясконца адлюстроўваецца будучыня.

У прадмове Янка Брыль піша, што збіраў сваю кнігу дваццаць пяць гадоў, яшчэ з даваеннага, заходнебеларускага часу.

Гэты непрыдуманы свет меў такую «памяць жанру», што засланяліся суцэльна ўсе магчымыя роды і віды літаратуры.

З галасоў, укладзеных у кнігу «Я з вогненнай вёскі…» і ў вітражы мініяцюр, вырас і наш паліфанічны беларускі Нобель — з такой жа ўвагай да дэталі, адчуваннем сюжэтнасці і вусцішнасці быцця. Сімвалічна, што менавіта Янка Брыль напісаў прадмову да першай кнігі Святланы Алексіевіч на беларускай мове.

Магчыма, толькі калі збярэцца ў адно ўсё напісанае Янкам Брылём, нарэшце прыйдзе ўсведамленне, якога маштабу пісьменніка мы маем. Пакуль жа аматары-бібліяфілы знаходзяць ціхую радасць у адшукванні невялікіх брылёўскіх зборнічкаў, у кожным з якіх абавязкова знойдзеш красу і спажытак для душы.

«Нельга пісаць інтэлектам, трэба быць унутры пісьма, пражыць жыццё над друкаркай, разумееце?» — пытаўся аднойчы Рэй Брэдберы ў журналіста.

Я думаю, Іван Антонавіч Брыль зразумеў бы, пра якое пісьмо і якую друкарку ідзе гаворка.

Бо і сам пражыў такое жыццё — пад сонцам найвышэйшай пробы.

Ціхан Чарнякевіч



Біблія — найлепшы бэстсэлер усіх часоў

У Мінску ўрачыста адзначылі 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

Ля будынка Чырвонага касцёла адбыліся навукова-асветніцкія чытанні. З прамовамі аб дзейнасці пачынальніка кнігадрукавання выступілі духоўныя асобы, даследчыкі, пісьменнікі, грамадскія дзеячы.

Святкаванне распачаў мітрапаліт Мінскі і Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч:

— Францыск Скарына прэзентаваў сваю першую кнігу 6 жніўня 1517 года, на свята Перамянення Пана. Біблія — гэта вечна жывое і дзейснае слова, дадзенае нам з мэтай нашага духоўнага перамянення.

Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч падкрэсліў, што Біблія і сёння з'яўляецца сусветным бэстсэлерам і заклікаў, каб яна стала настольнай кнігай беларусаў.

— У многіх яна ёсць у дамах, але запылілася. Прыйшоў час «адпыласосіць» Біблію, гарачым імкненнем пазнаць яе. Няхай юбілей 500-годдзя кнігадрукавання і духоўна-асветніцкае свята ў гонар Францыска Скарыны стануць новым імпульсам вывучэння Бібліі, каб на яе падмурку наша краіна перамянялася і будавала шчаслівую будучыню! — адзначыў іерарх каталіцкага касцёла.

Ігар Міхайлаў, старшыня Біблійнага Таварыства, згадаў не толькі пра адукаванасць, энцыклапедычныя веды Францыска Скарыны, але і духоўную мэту, якая ім кіравала: пакінуць назаўсёды народу вечную і невычэрпную мудрасць.

Старшыня беларускага клуба «Сябрына» ў Літве Валянцін Стэх распавёў пра святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў Вільні.

Доктар філалагічных навук Іван Саверчанка падкрэсліў тры асноўныя моманты значнасці скарынаўскай дзейнасці. Па-першае, выданнем Бібліі першадрукар заклікаў шанаваць Бога-Стваральніка ўсяго існага свету і вывучаць законы, пакладзеныя ў аснову ўсяго створанага. Па-другое, ён заклікаў цаніць і развіваць асобу чалавека як вяршыню ўсяго стварэння. Па-трэцяе, ён надаў увагу развіццю талентаў асобы, каб «дасканалы быў чалавек Божы».

Паэт Алесь Разанаў, аўтар кнігі «Маем найбольшае самі», які паэтычна ў сучаснай мове перастварыў тэксты прадмоваў Францыска Скарыны, падкрэсліў, што асветнік выкладаў людзям навуку Хрыстову і вучыў цаніць Боскі пачатак у чалавеку.

Пра даследаванні скарынаўскай спадчыны распавёў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай працы і выдавецкай дзейнасці Алесь Суша.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў зрабіў экскурс у гістарычную эпоху, у якую жыў першадрукар.

Як адзначылі навукоўцы, праз друкаванае слова беларусы здолелі не толькі далучыцца да інтэлектуальнай традыцыі свету, але і заявіць пра сябе. Францыск Скарына зрабіў крок да таго значэння, якое беларусы маюць у культурным сусветным развіцці.

У дольнай залі Чырвонага касцёла пачала працу выстава твораў беларускіх мастакоў на скарынаўскую тэму. Тут прадстаўлены працы Міколы Купавы, Алеся Марачкіна, Віктара Крука, Алы Губарэвіч і іншых. У мінскім Палацы мастацтваў 5 жніўня была разгорнута выстава маладзёвай і дзіцячай творчасці «Францыск Скарына — наш лёс, наша мінулае, наша будучыня».

Эла Дзвінская,
фота аўтара

Сапраўды напісанае застаецца...

(Стагоддзе Народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі)

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

З нагоды свайго пяцідзесяцігоддзя Пімен Панчанка надрукаваў у жніўні 1967 года характэрны для яго медытацыйнай лірыкі верш, які пачынаўся радкамі:

Паўвека...
Гэта шмат — паўвека.
Сплылі, змялелі сотні рэк.
І ўжо адно тваё павека
Нібы закрылася навек...



Так, паўвека — гэта шмат. А што ўжо казаць пра цэлы век. Пра цэлае стагоддзе. Цяжка ўкладваецца ў галаве, але наяве той факт, што спаўняецца сто гадоў з дня нараджэння натхнёнага песняра маладосці, песняра і веры, і вернасці, і вечнасці, і «любві да ўсяго, што ў народзе сваім і ў сваёй Беларусі».

Здымаю амаль спантанна з кніжнай паліцы яго паэтычныя зборнікі. З аўтографамі.

«Маўклівая малітва»: «Дарагі Анатоль! Мы вечна ў сэрцы молімся за некага і за нешта, а кагосьці праклінаем. Вось і я напісаў маўклівую малітву. Пімен Панчанка. 25.VI.85 г.»

«Вячэрні цягнік»: «Дарагому Анатолю Вярцінскаму, каб ён як мага пазней сядаў на вячэрні цягнік. З любоўю. Пімен Панчанка. 30.03.78 г.»

«Высокі бераг»: «Дарагі Анатоль Ільіч, не ведаю чаму так назваў з падказкі рэдактара сваю новую кнігу. Пэўна, лепш было б яе назваць «Горкія думкі» ці «Наш час» (ёсць у кнізе такія вершы). Ну ды ладна. Пачытайце, паглядзіце, знойдзеце і сваё імя. Даўно ведаю, цаню і люблю нашу паэзію. Яна ж — пра наш неспакойны час. Жадаю вам здароўя, творчай і жыццёвай радасці. 20.ІІ.93 г.»

Гэта што датычыць яго добразычлівых, шчодрых дароўных надпісаў. Захаваўся — напісанае застаецца — і ліст Пімена Емяльянавіча, адрасаваны мне як тагачаснаму рэдактару штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Вось гэты ягоны, прасякнуты адраджэнскім і грамадзянскім клопатам зварот (які і ў стагоддзе Народнага паэта застаецца, на жаль, актуальным):

«Дарагі Анатоль,

сёння прачытаў у «Звяздзе» артыкул мовазнаўцы А. Жураўскага «Мабыць, лепш Менеск?» Я супраць яго прапановы. Трэба аднавіць «Менск». Так заўсёды гучала ў народзе. «Минск» — гэта знак русіфікацыі. А «Менеск» не прыўецца з прычыны архаічнасці.

Газеты друкуюць у апошні час параўнальныя табліцы, якія даюць магчымасць даведацца, як гучала калісьці назва таго ці іншага пасёлка, гарадка, вёскі. Гэта актуальна, бо штучныя найменні блытаюцца, бо ў кожнай вобласці (а, бывае, і ў раёне) адны і тыя ж назвы калгасаў і саўгасаў, накшталт: «Першамайскі», «Маладзёжны», «Акцябрскі», «Дружба», «Пралетарскі», «Рассвет», «Запаветы», «Перамога» і г.д.

У нас калі парк ці тэатр, ці кансерваторыя, то абавязкова імя Горкага, імя Луначарскага. Брыдкая аднастайнасць. А наш цэнтр? Праспект Леніна і вуліца Леніна, вуліцы Кастрычніцкая, Камуністычная, Сацыялістычная, Савецкая, Камсамольская; імя Лібкнехта, Розы Люксембург, Урыцкага, Валадарскага, Маркса, Энгельса, Клары Цэткін, Ландара, Куйбышава, Калініна, Свярдлова, Будзённага, Варашылава... Каго там яшчэ? Ні ў адной нашай сталіцы, ні ў адным іншым вялікім горадзе такога ўра-рэвалюцыйнага «кагалу» няма і, пэўна, ніколі не будзе

І яшчэ пра адно: пра наш дзяржаўны сцяг. Некалі баязлівыя чыноўнікі, замест белага колеру, навязалі сцягу карункі... з жаночай спадніцы. З цягам часу забыліся, прывыклі, цяпер не ведаем. А ў мой час, памятаю, з нашага сцягу смяяліся: ну і сімвал: карункі!

Вось такі, замест верша, напісаўся ліст. Жадаю вам поспеху ў газетнай і дэпутацкай дзейнасці! Твораў любога жанру!

Салют!

Ваш Пімен Панчанка.

15.05.91 г.»

Лаўрэаты «Экслібрыса» імя Францыска Скарыны

6 жніўня, у дзень 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, былі абвешчаныя вынікі штогадовага літаратурнага конкурсу, арганізаванага Саюзам беларускіх пісьменнікаў і прысвечанага мастацкаму перакладу на беларускую мову. Пераможцамі сталі пяць маладых літаратараў.

Першае месца атрымала Іаанна Владыка за пераклад «Найлепшага месца на Зямлі» Тэрэсы Тышыньскай.

Другое месца — Алесь Емяльянаў-Шыловіч за падборку перакладаў з англійскай і польскай моваў.

Трэцяе месца — Сяргей Матырка за пераклад «Вялікага Гэтсбі» Ф. Скота Фіцджэральда.


Прызёрамі конкурсу сталі таксама Надзея Квасняк за пераклады вершаў Юльяна Тувіма і Яўгенія Лабоха за пераклад Сакі (Гектара Х'ю Манро).

Творы лаўрэатаў і канкурсантаў будуць надрукаваныя ў «новачасным» дадатку «Літаратурная Беларусь», часопісе «Дзеяслоў» ды інтэрнэт-часопісе «ПрайдзіСвет». Цырымонія ўганаравання пераможцаў адбудзецца ў верасні.

Прэс-служба ГА «СБП»

Зямля і земя. Корань тут адзін...

Нядаўна Мінск наведаў Найдан Вылчаў. Нагадаю, хто не ведае, — знаны балгарскі паэт і перакладчык (узначальваў шмат гадоў Саюз перакладчыкаў краіны), лаўрэат шэрагу літаратурных прэмій, і — прыехаў да нас зусім невыпадкова і не ў першы раз: даўні і верны сябра Беларусі, прыхільнік нашай мовы, літаратуры і гістарычнай спадчыны. Можна сказаць, адкрываў нашу літаратуру балгарскаму чытачу. І рабіў гэта мэтанакіравана, надзвычай адказна.



Паведаміўшы мне па тэлефоне пра яго прыезд, старшыня Таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежжам Ніна Іванова яшчэ заўважыла: «Гаворыць Найдан, што прыехаў, каб развітацца з намі». — «Развітацца? Што ён мае на ўвазе?» — «Мабыць, тое, што мінае час далёкіх падарожжаў. Здаецца, будзе адзначаць неўзабаве сваё дзевяностагоддзе».

Шмат разоў сустракаліся і ў нас, у Беларусі, і ў Балгарыі. І я збіраўся на сустрэчу ў Доме дружбы, натуральна, не без пэўнага душэўнага ўзрушэння. Перачытаў кнігу выбранай лірыкі Найдана Вылчава «Белая чайка», выдадзеную ў перакладзе на беларускую мову ў далёкім 1968 годзе. Пагартаў яго кнігу — нарыс пра Беларусь «Беларуская бяроза». Нават паспеў прагледзець манаграфію навукоўцаў — лінгвістаў Беларускага і Сафійскага ўніверсітэтаў «Беларуска-балгарскія моўныя паралелі». А яшчэ знайшоў і, што называецца, асвяжыў у памяці ўласныя вершы «Балгарыі»:

Друг і другар...
Калі ёсць друг, які
вялікаю адлегласцю аддзелены, —
вялікаю надзеяй абнадзеяны
ты на ўсе гады і на ўсе вякі.
Шыпшына й шыпка...
Усё той жа цвет.
Калючая, з шыпамі, тая ж ружа,
што на дарогах пацвярджае дружна
агульнасць нашых радасцяў і бед.
Зямля і земя...
Корань тут адзін,
карэнні тыя ж, тыя ж сокі.
хоць сцелецца тут гладзь раўнін,
а там узносіцца хрыбет высокі.
Балгарыя! Моцнае сэрца ўдар.
Друг і другар...


...Сустрэліся. Абняліся. Балгарскі госць спытаўся пра абставіны зыходу з жыцця Ніла Гілевіча. Распавёў: «Мае калегі падаліся гэтым летам хто куды: хто ў Італію, хто на Лазурны бераг, хто ў Нью-Йорк. Ну а я параіўся з Мінкай і вырашыў: калі ўжо куды і ехаць, дык толькі ў Беларусь. Чуў аднойчы ад некага з вас: дзе скарб твой — там і тваё сэрца...» Падараваў свае апошнія па часе кнігі: «Тракийска фреска» і «Една българска роза». Сказаў: «Паглядзі, пачытай і напішы мне»...

Чытаю, знаёмлюся (праўда, месцамі не без слоўніка), параўноўваю сённяшняга Вылчава з ранейшым. І перад тым, як пісаць у Сафію, ды каб ліст быў больш змястоўны інфармацыйна, пераклаў некалькі вершаў на сваю мову для «навачаснай» «Літаратурнай Беларусі».

Анатоль Вярцінскі

Святая справа

Найдан ВЫЛЧАЎ



Балада пра атрад Боцева

Ах, ёсць яна, ёсць яна,
песня высокага ладу!
у сэрцы народным палае,
як вечны касцёр,
вось гэта балада, страшэнная
гэта балада
пра сто дваццаць душ — як на падбор.
Над светлым Дунаем чэтнікі
сталі ўздымацца,
да чорнай Аколчыцы свой шлях*
скіравала іх раць.
Ішлі яны, маці, каб за цябе змагацца,
ішлі яны, маці, каб за цябе паміраць.
Але ж гэта ўсё — не песні і словы,
не лісця звон ціхі, што поўніць
вясновы гай,
ах, гэта ж усё — прабітыя куляй
галовы,
і кроў на скале, і крумкачыны грай.
Баладай бяссмертнай стала
святая справа,
у памяці нашай палае, як вечны касцёр,
і гордая гібель, і гордая слава
душ ста дваццаці тых —
што як на падбор.
Над сінім Дунаем чэтнікі сталі
ўздымацца,
да чорнай Аколчыцы скіроўвае
шлях іх раць.
Ідуць яны, маці, каб за цябе змагацца,
ідуць яны, маці, каб за цябе паміраць.

Жанчына

— Скажы, хто першай жанчынай была
тваіх наіўных юначых мрояў?
— Знікла яна ранняй парою,
як міг рамантычнага святла.

— Скажы, хто пяшчотнай жанчынай
была,
якую забыць ты, пэўна, не ў стане?
— Забуду. Хваля быць перастане
ад хвалі другой, што ўслед падплыла.

— Скажы, хто цёмнай жанчынай была,
якая ўсё ў попелператварала?
— Бачу я вунь вугалёў нямала,
але няма ў іх ні кроплі цяпла.

— Скажы, хто вечнай жанчынай была,
якая разам з табой дажывае?
— Не чуеш? Сына майго люляе
з вечнаю песняй: «Бай-баю-бааа».

Дзевяностыя

Занадта ж ясны фокус гэты:
так проста дзяліць на «гэтых» і «тых»,
дзяліць, як быдла бязмоўнае, ўсіх,
рашаць, якія сяг болей адметны.

Балгарскі флаг заўсёды адзіны,
адны ў нас нябёсы і зямля.
І шлях балгарскі, шлях былінны —
на палымяны ўсход... І я

тройчы памерці гатовы, згодны,
не бачыць каб будучыню, у якой
падзелены будзе народ мой родны
на багацеяў і беднякоў.

* Аколчыцы — назва горнай вяршыні ў Балканах.

У падзямеллях Геванта

(Фрагмент рамана)

Тадэвуш МІЦІНЬСКІ

Выйшаў Маг Літвар на зорнае святло.

І зноў ён у пустэчы, высечанай сценамі чорных гігантаў. Цішыня настолькі велічная, што чуецца пад валунамі шолах росных струменьчыкаў.

У змроку, сярод блакітных туманоў, рушыла жанчына, нібы прывід.

Вечная сярод тых, хто жыве.

У яе руках была трохкутная арфа, струны якой прадвяшчалі Новае Адкрыццё. Над тварам, бялейшым за месяц, узносіўся гушчар цудоўных валасоў.

І распавядала тая песня пра гады чакання сярод слёзаў і пакут. Звярталася да сваіх патаемных думак, народжаных слотнымі, лістападнымі, безнадзейнымі начамі. Да думак, што паўставалі ў ночы месяцовыя, зеленаватыя, магічныя, сярод бароў над берагам паўночнага мора. Песня пыталася, калі пераможа Каханне?

Злавесны боль прымружыў вочы Мага Літвара.

У яе слязах парушаліся скляпенні нябёсаў.

Маг Літвар, нерухомы вартавы, стаў ля брамы смерці і вымавіў у вечнасць: ніколі! Заўважыў, што ўстрапянуліся кончыкі яе далікатных, з пералівамі розных адценняў, пальцаў. Зірнуў, але не ў вочы яе, падобныя да гротаў, дзе фасфарычна зззяе аметыстамі і чорным агатам азёрная глыбіня Марскога Вока, — зірнуў у страшэнны змрок пекла, якое пакрывала яе вязніцай.

У змроку тым бліснэла некалькі цьмяных зорак — гэта быў Змеяносец. Паказаў ёй: нібы яе ўзводзіў на алтар і прыносіў у ахвяру богу Пекла. Прамовіў словы моцныя, недасяжныя.

Яна адышла.

Чуў яе ціхія крокі, нібы хтосьці пад зямлёй забіваў цвікамі труну, — цішэй — нібы сыпалася зямля на твар памерлай — так незваротна, як дакрананні кінутых у магілу кветак.

Тадэвуш Міціньскі нарадзіўся ў 1873 годзе ў польскай Лодзі, а загінуў пры таямнічых абставінах у 1918 годзе ў Беларусі, пад Чэрыкавам. Загадкавы раман «Нятота. Таемная кніга Татраў», прасякнуты ідэямі месіянізму і містыцызму, лічыцца адным з галоўных яго твораў. Фрагмент гэтага рамана і прапануецца чытачам «Літаратурнай Беларусі».

Змоўкла пустэча вялікіх гор.

Змрочны Гевант пужаў — прадвеснік смерці, суправаджальнік да краю ценяў, ён іскрыўся ад зор. Маг прылёг у лагчыне гары.

Невядома, колькі нерухомых эпох — глядзеў уверх, дзе плыў на нябачнай барцы таямнічы, жахлівы месяц. Падножжа гары, што нагадвала магілу рыцара, распасціралася на некалькі далінаў і мела такую велізарную вышыню, што манументальны крыж на рыцарскім шлеме здаваўся цацкай. Галава, патрэсканая ямінамі і прадоннем, не змяшчала ўжо выявы твару.

Боль і таямнічасць згушчаліся ў нейкі звышчалавечы выгляд вусціішна скамянелай Бясконцасці. Памерлі мільёны ляхаў, змяніўся шэраг каралеўскіх дынастый, перш чым тыя шматпавярховыя валуны з шэрага граніту былі абцятыя даждамі ды снягамі і зведалі на сабе ўздзеянне лавінаў, перш чым гігантская рака высекла вадападам каменную масу ў бажніцы Геванта.

Маг Літвар адчуў унутры ўсхваляванае пачуццё тоеснасці з тым, чый прах ужо даўно быў развеяны з па-блюзнерску парушанага кургана. Але прасякнуты болем вечнай Ілюзіі, вымавіў у найглыбейшым маўчанні сваім: не кружляе нічога над пустэчай знішчэння!..

Каменны гмах раптоўна пахіліўся на бок, цела Мага, што перад тым ляжала бяспечна, цяпер завісла над безданню, дзе лесам коп'яў тырчэлі яліны.

Ён трымаўся за скальны выступ, а Гевант сваёй магутнай вагой схіляўся ўбок насуперак усім законам гравітацыі...

Мабыць, Гевант хацеў спалохаць такім чынам Мага, як мамант малую казурку, што зачапілася за агромністы карак; лінію гарызантальную ён зносіў перпендыкулярна і спадаў, але найбольш здзіўляла тое, што рухі адбываліся ў вакууме, то бок удараў аб зямлю не было чуваць! Раптам, быццам карабель падчас буры, які сядае на водмель, Гевант цяжка абваліўся, а скалы страпянуліся, як подых бушуючага мора. Кожны смяротны страціў бы прытомнасць ад знясілення і жудасці і зрынуўся б з тых паверхаў, вышэйшых за муры Вавілонскай вежы.

Знянацку бліснула святло, запаленае ў аддаленым кутку — можа, месяц кінуў з-за хмары свой заходзячы прамень? Не, хутчэй гэта быў бляск унутры Геванта.

Маўчанне. Нечаканы спакой. Маг рушыў па біўнях вапнавага дна Прамора Татраў. З галавы ідала святло здавалася зусім далёкім і ўрэшце згасла.

Калі Маг Літвар урэшце агледзеўся перад уваходам, прыхаваным у трохкутніку забрала Геванта, з вуснаў яго сцякала крывяністая юшка.

Пераклад з польскай мовы Ірыны Хадарэнка

Шчонаўскія абразкі



Альжбета КЕДА

Гарадзенская пісьменніца Альжбета Кеда (Ала Петрушкевіч) напісала кнігу пра сваю родную вёску Шчонава, што ў Карэліцкім раёне. Сабрала аскепкі вялікага свету, якога ўжо няма. Яе вёска памірае. Кніга — помнік мінуламу. Напісаная з любоўю. Прапануем урывак з яе.

Анісія і Мікалай

Яны кахалі адно аднаго. Але Мікалай Валенцік быў бедны. Не пашанцавала Анісі. Аддалі яе замуж у Малюшычы. Толькі дзіцятка нарадзіла, памёр мужык. Мусіла тады пайсці за Галяшука, старога ўдаўца. Ён таксама нядоўга пажыў.

Мікола ўзяў Яўгасю з Кайшовак. Але лёсіла ўсё ж ім з Анісяй сысціся. Аўдавелі амаль у адзін час. І пабраліся. Пяты шлюб на дваіх. У Анісі была дачка Ліза, у Мікалая — Ліда. Перажывала дзяўчынка, калі мачыха ў хаце з'явілася. Пратэставаць імкнулася. Але хто на яе зважаў? Спаць іх з Лізаю на печы паклалі. То яна сваёй новай сястры выказвала: «Чаго твая маці з маім бацькам спаць легла?» Раўнавала бацьку, сваю маму згадвала. Але змірылася. І з Лізаю ўсё жыццё, як з роднаю, пражыла, сябравала.

Яшчэ і сваіх дзвюх дачок Анісія з Мікалаем нарадзілі: Насцю і Таню. Прыгожыя, акуратныя дзяўчаты былі. Падросшы, служылі ў бацюшкі ў Райцы пакаёўкамі. Райчанкамі сталі.

Бэля

Гэтае імя было ў Шчонаве мянушкай. Выкарыстоўвалі як абразу, лаянку, дастасоўваючы да яго не вельмі лагодныя прыметнікі. Насамрэч такая асоба існавала ў 30-ыя гады.

Прайшлася тая яўрэйка Бэля па маім Шчонаве, дакладней, праехалася, не надта прыстойную славу па сабе пакінуўшы. Жыла яна на Зелянцы, краму трымала. Мела дзвюх дачок, Этку і Лізу, а мужа ў яе не было.

Не маркоцілася кабета. Гандаль ішоў спраўна. Ведалі людзі, што махляваць добра ўмела. Часта ў яе хаце п'янкі-гулянкі ладзілі, якія прывабілі няўстойлівых мужчынаў.

Упадабаў яе адзін шчонавец. Пакіне жонку, дзяцей і сыдзе з хаты. Пажыве ў тае Бэлі, набалюецца, нацешыцца, а пасля дахаты вяртаецца. Яна праз які дзень следам на падводзе прыязджае. Заходзіць у свіран і насыпае ў мех збожжа. На роспачныя крыкі жонкі пра тое, што сярод белага дня такі крадзеж учыняе, спакойна адказвала:

— Твой муж у мяне жыў, еў. Чаму я мушу яго дарма карміць? Забіраю столькі, колькі з'еў.

Такое ўяўленне пра справядлівасць было ў Бэлі.

Вузел

Завязаўся між трыма маладымі людзьмі моцны вузел.

Сястра Уладка Пасэсара Жэня кахала Мішу Таўлуя, брата Валадзенькавага. Каханне было ўзаемным. Ужо і да вяселля справы ішлі. Але не адбылося вяселле: пасагу, які сваты запрасілі, не меў Уладак для сястры. Разышліся іх сцяжыны. Хлопец жонку Вольку з Савашоў узяў, дзетак прычакалі. Праўда, Коля, сынок іхні, ужо падлеткам будучы, памёр, прастудзіўшыся, як каровы пасвіў. Дачушка маленькая засталася.

А Жэня замуж у Рамейкі пайшла за Сцяпана Мялешку. Ды не змірылася яна з тым замужжам. Вярнулася ў хату, дзе брат з сям'ёю жыў. І стала з Мішам сустракацца таемна. Мілуюцца ноччу, а пасля ён дахаты вяртаецца і спаць у гумне кладзецца. Ды аднойчы страшны сон прысніўся яму. Быццам нябожчыкі яго душылі. Крычаў нема, прачнуцца не мог. Злосць сваю на жонцы зганяў. Столькі гора, несправядлівасці, здзеку ад мужа Волька вытрывала. Біў ён яе, з хаты не раз уцякала. А ён следам ляцеў. Хавалася на могілках. Ляжа між магілкамі, той і не згледзіць. А пасля і зусім сысці мусіла да сястры ў Воўцу. А Міша прывёў у сваю хату Жэню. Жыў з ёю, хлопчык у іх нарадзіўся. Мішам назвалі.

Толькі праз два гады вярнулася Волька з дачушкай у сваю хату. Калі мужа на вайну забралі. Так і жылі яны разам, дзве жонкі аднаго мужа. Нат і ладзілі. Дапамагала Волька малога Мішу глядзець.

А Міша старэйшы з вайны не вярнуўся. Мусіла Жэня пайсці з тае хаты. Бо Волька першая, законная жонка. Жыла Жэня ў свайго дзядзькі Кірэя на хутарах. Ды захварэла яна на сухоты, якія і звялі жанчыну ў магілу. Сыночка яе ў дзіцячы прытулак аддалі. Падросшы, прыязджаў некалькі разоў у Шчонава. Толькі хто яго тут чакаў? Мо і зараз жыве недзе ў свеце вялікім.

Толькі смерць, умяшаўшыся, той вузел мілосны развязала.

Чайка Мікіта

Не так многа было ў Шчонаве мужчынаў, што з-за каханкі жонку пакінулі, дзяцей пасіраціла. Чайка Мікіта якраз з такіх.

Хата ягоная стаяла ў канцы Кліна. На тым месцы, дзе пазней Апалонік сваю пабудуе. Жыў ён са сваёю Зосяю, пяцёра дзетак мелі: Аркадзя, Ніну, Валодзю, Мілку і Міцю.

А ў школе, што была ля Захомаў, у колішнім доме аканома Пахалінскага, працавала настаўніцаю нейкая нетутэйшая кабета па прозвішчы Качаргіна. Відаць, усходніца. Закахаўся ў яе Мікіта. Ды так, што сям'ю сваю кінуў, пра дзяцей нявінных не падумаў. З'ехаў ён з тою Качаргіною няведама куды. Ніколі больш у Шчонава не паказаўся.

Зазнала гора бедная Зося з дзеткамі. Працаваць з малымі цяжка давялося, галадаць. І біду страшную перажыла. Узяў



да галавы яе сынок Валодзік, што бацька іх кінуў. Не перажыў гэтае ганьбы. Захварэў і памёр маладзенькі.

Толькі адзін Міця, які ажаніўся з Гэляю Валенцікаваю, на Радзіме застаўся, у Карэлічах жыў. Астатнія ўсе выехалі недзе далёка. І ніколі не прыязджалі ў Шчонава.

Пасаг Ганны Юлькавай

За Польшчаю тое было. Юляк Яўсей знайшоў пярсцёнак. Вельмі прыгожы, залаты, з камнем барвовым. Відаць, нейкі пан згубіў. Гаспадар не знайшоўся. Застаўся пярсцёнак у Юляка. Прыязджаў жыд з Варончы, шмат грошай за пярсцёнак даваў. Ды не прадаў Юляк тую прыгажосць.

— Гэты пярсцёнак будзе Ганнін пасаг, — так заявіў.

Ганна была вельмі прыгожай, ужо й на дзеўку бралася.

Малодшы сын Юляка Андрэй служыў у пана ў Руткавічах. Закахаўся ён у адну дзяўчыну. А яна, відаць, не надта сумленнаю была. Што казала хлопцу, што дакляравала, ніхто таго не ведае, але выкраў ён у бацькі пярсцёнак і занёс каханцы. Ды не выйшла тая за хлопца замуж. Падманула. Андрэй з вайны не вярнуўся. Засталася самотнаю й Ганна. Пасля таго, як нагу страціла, вырашыла, што замуж не пойдзе. Хоць і сваталіся яшчэ да яе неадночы.

Што з тым пярсцёнкам? Праз многа гадоў пераехала сям'я Колі Барэйкавага ў вёску, дзе замужам была Андраева каханая. Ганна прасіла Колю спытаць у яе пры нагодзе, дзе пярсцёнак. Спытаў. У адказ — маўчанне.

— Нічога не сказала. Ні слова. Як вады ў рот набрала...

Недзе ж ён ёсць, той Ганнін пярсцёнак. А мо і няма. Мо пераплавілі золата...

Трагічнае каханне

Анюта Максімава была дзяўчынай прыгожай. Кахала яна Толю Якубавага. Немалы час каханне доўжылася. Але здрадзіў Толя, прывёз з войска сабе жонку Соню.

Так пакутавала Анюта, што не вытрымала, у студню кінулася. Дасталі яе яшчэ жывую. Але захварэла пасля таго моцна. Не выратавалі. Памерла маладая. Калі б не здарылася гэтая бяда, пайшла б замуж за Алеся Навумчыка, якога Зайчыкам у вёсцы клікалі. Браў ён яе, любіў, не глядзеў, што з другім сустракалася.

А помнік па ёй брат Федзя паставіў. Сапраўды, прыгожая дзяўчына пазірае са здымка. Пляменніца Галя да яе падобная.

Хто асудзіць?..

Жыццё ўдоваў, якіх у Шчонаве, як і ў кожнай вёсцы беларускай пасля вайны шмат было, нялёгкае. Гэта вядома. Але размова зараз не пра тое. Пра справы амурныя.

Жаночае цела, а яшчэ ж такое маладое, прагнула пяшчоты, кахання, ласкі мужчынскае. Не ўсе жанчыны аднолькавыя, не ўсе маглі тэмперамент свой перамагчы, утаймаваць.

Адна такая ўдавіца жыла з сям'ёю свекрыві. Прымала мужчынаў чужых. Летам то яшчэ і нічога... І сена недзе ў стагах ці на вышках духмянае, і травы высокія, і лес з палянамі сунічнымі каханне грэшнае схаваюць. А зімою? Дзе схавацца кабеце са сваім шчасцем украдзеным? Вось жа, прыводзіла тая жанчына мужчынаў дахаты. Як толькі ўгледзіць свякроў праз вакно, што нявестка госця вядзе, плакаць пачынае на ўсю хату, галасіць, як па нябожчыку. А дачка супакойвае маці як можа: «Чаго ты плачаш? Ці табе шкода яе? Сціхні».

Адно бяда: жанатыя тыя мужчыны былі. Але мірыліся неяк кабеты. Сварыліся, зразумела...

Хто сёння асудзіць тую «грэшніцу»? Па-біблейску: няхай той каменем кіне, хто сам бязгрэшны. Ды і даўно ўжо яна там, дзе суд справядлівы, высокі. Няўжо не ўлічаны будуць абставіны, што да граху чужаложства няшчасных удоваў даводзілі?

Такія розныя...

Уявіце такую карціну. Ідуць мужык з жонкаю з Хвалава, з гасцей вяртаюцца. Даходзяць да хаты аднае ўдавы. Мужык кажа:

— Ідзі дадому.

Жанчына паслухмяна, нічога не кажучы, ідзе да свае хаты, што ажно ў канцы Шчонава стаяла. А мужык? Зразумела ж, да тае ўдавы зварочвае. Жыве ў яе дзень, два. Колькі захоча. Працаваць дапамагае. Пасля дадому вяртаецца.

Чаму яна маўчала, чаму не сварылася, не пратэставала? Казала на тое:

— Што зробіш? Ці буду я крычаць, ці не, усё роўна ён да яе пойдзя.

Відаць, мела рацыю. Бо другая кабета, муж якое да тае ўдавы таксама завітваў, што толькі ні рабіла: і крычала, і сварылася, — усё роўна рады даць не магла.

Былі гэтыя жонкі прыгожыя, працавітыя, нічым за тую ўдаву не горшыя. Не кідалі іх мужыкі. Так толькі... на час сыходзілі.

А цымус увесь у тым, што кабеты тыя — родныя сёстры. Такія розныя...

Невінаватыя

Унізе, ля самае дарогі, насупраць беднае хаты ўдавы Барэйчыхі, што стаяла на ўзгорку, рос клён. Сад, агарод, соткі, — усё было схавана за хатаю. Змарнелы куст бэзу з правага боку, ля вакна, здалёку не быў відаць. А высокае дрэва выглядала ва ўсе канцы, было знакам сядзібы.

Настаўніца Валя, што жыла з мужам і маленькім сыночкам у той беднай хаціне разам са свякроўкаю, залоўкаю і дзеверам, любіла прыгожае дрэва. Не перастала любіць і тады, калі з'явіліся на яго ствале тлустыя плямы, белая і чырвоная. Першая ад пахучага крэму «Сняжынка», другая ад памады. Раззлаваўся аднойчы яе муж, схапіў тыя няхітрыя жаночыя падмалёўкі, выскачыў з хаты, разламаў і пабіў аб клёнік. Была прычына. А вінаватым не быў ніхто.

Некалькі гадоў таму працавала Валя ў недалёкім, але і не надта блізкім мястэчку Цырыне. Звольнілася, атрымала працу ў Шчонаве. Адзін цырынец, якому ўпала ў вока прыгожая настаўніца, памятаў яе. Праз некалькі гадоў вырашыў знайсці. Выбраўся неяк нядзелькаю, даехаў да Рамейкаў. Было вельмі рана. Ішоў па дарозе да хутароў у надзеі сустрэць кагосьці, каб распытаць, дзе жыве настаўніца. Ажно бачыць: ляціць насустрач вершнік. Прыпыніў, патлумачыў, каго шукае. Той нечакана вырашыў вярнуцца і правесці да хаты. Пра што яны гаварылі, ці гаварылі наогул, ніхто не ведае.

У хаце ўсе яшчэ спалі. Свякроўка шлупалася на кухні. Раптам адчыняюцца дзверы, маладая жанчына чуе голас мужа: «Госць да цябе прыйшоў. Прымай!» А ў хатцы той ні перагародкі, ні шырмы якое. Глянула яна з пасцелі і знямела, пазнаўшы госця няпрошанага, неспадзяванага. І што сказаць яму, не ведала. Ціха папрасіла сыйсці з гэтае хаты.

Вось тады і паляцелі ў клёнік крэм, памада...

Не мела яна крыўды на мужа. Не мела і на тога даўняга знаёмага. Толькі няёмкасць, прыкрасць ад недарэчнае сустрэчы засталіся назаўсёды. Ніколі больш не сустрэла яго.

А ад мужа папрокі чула амаль усё жыццё...

З новай кнігі «Вогнепаклонніца»



Іна СНАРСКАЯ

***

Напамяць чытала сумныя вершы
І так наіўна верыла ў шчасце.
Гэтак бывае: успомніцца першы
Каханы, —
і — сэрца, і дзверы насцеж.

Зноў так наіўна верыцца, сніцца:
Раптам, а можа?.. Трывожна. Мурожна.
Бедная б'ецца ў грудзях сініца,
Нібы за кратамі. Божа ж мой…

***

Гараць снягі,
Сівеюць скроні,
А я у Бога на далоні.

Снежань

Сосны селі за кросны
Ткаць срэбны кужаль аблокаў.
Прыляцеў чорны сокал —
Пацямнела навокал.
Прыляцеў сокал белы —
І завылі мяцеліцы.

***

Паміж дажджамі прарасці,
І сцішыцца блакітнай кветкай,
Каб сны Радзімы бачыць зрэдку,
Хмарынкі родныя пасці.

Усё, што творыцца здаля,
Усё, што вернае на дотык,
Аддам, як мёд пчаліны соты.
Бяры, дзяцінная зямля!

Белы верш

«Хвілю яшчэ пабудзем вадою,
нахіленым дрэвам, сонцам…»
(К.Галчынскі)

Далонь сваю працягні. Вось крыло.
Мы разам ляцім да сонца…
Прысніся… Прысніся хаця б
Да першага снегу, да першага лістападу.

Я шукала цябе ў паднябенні праменьчыкаў лета.
Паддашкі усе абыйшла, усе сутарэнні.
Карэнне маё аплятала тваю зямлю,
Калыхала ў калысцы нябёсаў.

Калі холадам сцісне знямелыя скроні,
Гавары са мной мовай аблокаў і вершаў.
На адлегласці подыху. На алегласці развітання.
Заінелы, далёкі,
да сустрэчы, да прылятання.

***

Перакладзі мяне на мову сэрца.
Усе мае лясы, усе трывогі,
І гэты дзень стамлёны, тканы шэрым,
І васілёк у жыце ля дарогі.

Перакладзі хмарынак пазалоту
На берагах шчымлівых птушкі-сонца,
І слова «жыць», і словы «вольна лётаць» —
Сінонімы маёй зары бясконцай.

Перакладзі надзею — светла, шчодра,
І першы пацалунак, і астатні.
Тады скажу табе нарэшце: «Родны,
А крылы ўваскрасаюць на світанні».

***

Размаўляю з маімі сябрамі
На старонках падораных кніг,
І крылатых радкоў арыгамі
Дакранаюцца вуснаў маіх.

Пасміхаюся без прычыны,
І святлее на сэрцы з таго,
Што кранаецца неба Айчыны
Вечаровага сонца майго.

***

Калі каханне папросіць,
Не адмаўляй яму.
Птушкаю сіняй восень
Села ў маю траву.

Стала так светла, велічна.
Вочы мае — вякі.
Вось заспявалі весніцы,
Ўпалі да ног шаўкі.

Суджаны, мной абуджаны,
Быцццам жалейка я.
Грай залатымі ружамі,
Званочкамі салаўя.

Табе кашулю вышыла
Нашча, промням вясны,
І пералётнаю вішняю,
І першацветам лясным.

***

Чысцей няма нічога за вяртанне.
З усіх дарог, з усіх паўднёвых казак.
Лячу дамоў жаданым словам, сказам,
Нявыпітым на брудэршафт світаннем.

***

Прыбраўся кветкамі горад,
Дыхае чыста, празрыста.
А недзе сівое гора
Ваўкамі жалезнымі рыскае.

Як вымавіць слова «вайна»,
Гаручае і калючае?
За спомін душы віна
Выпіць. Віною змучаныя

Усе, хто сэрца збярог.
Раве ашалелы вецер
У небе пустых дароў,
У небе знямелых весніц.

Вясна прыйшла і туды —
Пралескі цвітуць і ў пекле,
І прывіды сноў — сады
Салдацкія слухаюць песні.

Памяці сябра

Твае берагі, пералескі —
Далёка, пякуча, балюча.
Рукой не дастаць, не дабегчы, —
Расой засяваць гаручай.

Але пералётнае сэрца
Адчыніць вароты Раю,
І дзень размалюе шэры
Вясёлкай ад краю да краю.

Бо ведае: не ўміраюць
Тыя, каго мы любім.
З верай вакно адчыняю:
Прылятай, мой галубе!

Роднай мове

Цябе успомніць сэрца па складах,
Па шыльдачках і прыдарожных знаках,
Па дзедавых намоленых крыжах
І па званочках, пацалункам насцеж.

Цябе пазнае сэрца па дажджу,
Па заінелых восеньскіх каштанах.
Я перайду ўтравелую мяжу
Узнёсласці і падарункаў танных.

І прарасце, і зазвініць жыццё
На скрыжаваннях веры і нябыту.
Вунь паляцеў гадзіннік, не пацёк,
Як у Далі. Наканавана быць нам!



Дзяўчыначка, адчайная душа,
Стаміўшыся ў гармідары вакзалаў,
Зноў да цябе па спарышу прыйшла.
Пагаварыў з ёй Віцебскам Шагала.

Напярэдадні Каляд

На ростанях зімы святлеюць вочы неба,
Штодзённую раку я перахажу ўброд,
А за мяне бацькі кладуць жывыя трэбы
На тым канцы дажджоў, сумненняў і турбот.

Там моляцца за нас, а мы за іх старэем,
А мы за іх ідзем да берагоў душы,
І для сваіх дзяцей мы сталі ўжо карэннем,
Трымаем на плячах зялёны звон вяршынь.

І будзе так заўжды пакуль зямля зямлёю,
І Божы Сын пакуль ляжуе ўсіх нябог.
На ростанях зімы пішу сваёй крывёю,
Што небыцця няма. Ёсць вера і любоў.

Бабулі

Перад смерцю бабуля спявала.
На праменьчыках родных, лясных
Маладосці пляла каралі
Успамінамі да вясны.

І ляцелі ўспаміны птушкамі
Над трыпутнікам долі зямной,
І вятрыскі калыскі гушкалі
З мамаю і са мной.

І вясельную сукню золатам
Вышывалі снягі,
Заручалася з воляй ты,
З ветахам дарагім.

Бегла ты пералескамі нашымі,
Чула гоман бароў,
Калі сонца давеку нашчае
Перавозіў Харон.

***

Не пасляваю жыць
не для сябе, для іншых,
І дарагіх людзей
губляю па чарзе.
Гараць мае лясы —
душу ўкрывае іней.
Гарыць мая зямля —
скляпенне сноў-надзей.

Не пасляваю жыць
за хлебам, не за срэбрам
І некалі сустрэць
сваіх сівых сяброў.
Ляціць, ляціць жыццё
да брамы ў лютым небе.
І не хапае сіл,
і не хапае слоў…

Ластаўка

«Адчынім фортачку зімою:
А можа, ластаўка ўляціць?»
(Аляксей Пысін)

Усе ластаўкі сёння за морам.
Ці лёгка за морам жыць?
Мараю, не, марою
Чужая зямля ляжыць.

Цёпла. Але не цешыць
Гэтая цеплыня.
Ластаўка вострым ценем
Рэжа далоні дня.

І цяпельца не грэе крылы.
Горла сціскае крык.
Родную зямлю ўкрые
Воўчы снег баравы.

Ластаўка, сваё сэрца
Да вясны прыгартай.
Не карыся зіме і смерці —
Пры-ля-тай!

***

Чатыры дарогі — і кропка адліку.
Бачу сем спакус сваіх,
Сем поўняў вялікіх.
Чатыры дарогі. Скрыжаванне.
Агнём у целе:
«Ты песень хацела?
Чаму твае песні
Душу ўжо не песцяць?»
Бо кропка адліку —
Вусцішная і вялікая…

***

Дабраславі жыццё,
зялёная старонка,
Дзе хмарак чарада
зямныя сны снуе.
На крылах цішыні
спявае сэрца звонка
Пра тое, што было
і будзе ў мяне.
Дабраславі людзей
такіх балюча-родных.
Вучыцца даравацць
мы будзем пакрысе,
Знаходзіць чарназём
сярод пустынь бясплодных,
Якімі сорак год
вадзіў сірот Майсей.
Мы з розных берагоў,
але народзяць нівы,
Пад ветрам зашумяць,
дадуць свае хлябы.
Напіцца цішыні
і быць з таго шчаслівай…
Дабраславі, зямля,
і навучы любіць.


***

Далей, далей ад шэрых плошч,
Да знічак на вадзе.
Алівы кветку птушка-ноч
Мне на далонь кладзе.

І там, дзе горкая трава,
Дзядоўнік і палын,
Крыніцам вочы адкрываць,
Як лепшы успамін.

Мяне чакае сто дарог
І родная — адна.
Яе для мужных Бог збярог,
Хто горыч піў да дна.

Пляц
Фрагменты аповесці



Лявон ВАЛАСЮК



— Страявым будзеце ў мяне хадзіць вакол стала, а потым — на пляц! — ля дзвярэй службовага памяшкання чарцёжнікаў нечакана пачуўся пагрозлівы крык палкоўніка Шарбакова, які нядаўна толькі быў прызначаны новым начальнікам Аператыўнага ўпраўлення Штаба Паўднёвай групы войск замест былога — франтавіка — палкоўніка Кывабока.

Твар Шарбакова быў шэра-фіялетавы на фоне белых дзвярэй, маршчыністы і непрыемны ад злосці. Да таго ж новы начальнік насіў акуляры, якія даводзілася яму час ад часу папраўляць, бо ад крыку яны зляталі на кончык вялікага носа.

«Добра пачынае!» — падумаў прапаршчык Казараў, азіраючыся па баках, нібыта баючыся, што нехта падслухае яго думкі... Казарава на службу ў Венгрыю ўладкаваў палкоўнік Кывабок — яны разам працавалі ў Генштабе ў Маскве.

Усе васьмёра салдат-чарцёжнікаў і прапашчык Казараў сталі па стойцы «смірна», папраўляючы рамяні, зашпільваючы гузікі і каўнерыкі «хб».

Чарцёжнікі наструнена чакалі далейшага развіцця падзей. У летнюю спякоту цяжка было працаваць зашпіленым на ўсе гузікі і кручкі ў цесным памяшканні, дзе не было нават вентылятара. Адчыненыя вокны не ратавалі ад душнага паветра. Гарачая летняя пара рабіла сваю справу.

Папярэдні начальнік дазваляў салдатам адчуваць сябе вольна. Нават аднойчы загадаў прапаршчыку Казараву, каб той заняўся пашывам лёгкага адзення для працы ў задуху. Ды толькі Іван Васільевіч не зусім сур'ёзна паставіўся да яго даручэння: масквіч, ён у свае трыццаць не супраць быў выпіць, гульнуць ды і да працы быў не вельмі ахвочы. Словам, прапаршчык!..

Салдаты-чарцёжнікі, людзі ў асноўным бывалыя, займалі трэці паверх штабнога будынка. Ніжэй пад імі знаходзіліся кабінеты камандуючага групай войск і начальніка штаба, іншых старшых афіцэраў... Паміж ваеннаслужачымі склаліся добрыя адносіны, таму прыход палкоўніка-навічка ў Штабе ўспрынялі насцярожана: палкоўнік Шарбакоў, прайшоў слух, прыехаў з Масквы пасля заканчэння вучобы ў Акадэміі Генштаба на службу за мяжу за генеральскай зоркай. А ягонае яўнае салдафонства не стасавалася са штабным этыкетам...

Яўген, салдат апошняга года службы, усміхнуўся сам сабе, успомніўшы словы «пляц» яшчэ з «гражданкі». У яго пагранічным горадзе над Бугам на Пляц у гарадскім парку хадзілі на танцы. Там заўжды было весела ад музыкі, ад знаёмстваў з дзяўчаткамі, ад сустрэч з сябрамі-таварышамі...

— Салдат, а вы чаму ўсміхаецеся?! Служба вельмі салодкая? Дык я вам арганізую з гэтага дня!.. — палкоўнік збіраўся яшчэ нешта пагрозліва выкрыкнуць, але раптам затрашчаў тэлефон. Прапаршчык кінуўся да яго, спытаў у палкоўніка дазволу і падняў трубку. Хвіліну слухаў, а пасля адрапартаваў: — Будзе зроблена, таварыш генерал! — Казараў запытальна паглядзеў на палкоўніка, які пакрычаў яшчэ колькі хвілін для парадку і з каменным выглядам выйшаў з чарцёжкі, пакінуўшы дзверы адчыненымі. Праз іх можна было пабачыць вартавога з аўтаматам.

Іван Васільевіч голасна хмыкнуў, з сур'ёзным выглядам твару зачыніў дзверы і пакруціў пальцам ля скроні: усё і так зразумела...

...Валера Шавейка лічыўся добрым гітарыстам яшчэ падчас вучобы ў школе, а калі паступіў у будаўнічы інстытут, то і там не згубіўся. У інстытуце быў свой музычны калектыў «Залатая сярэдзіна», куды і паспрабаваў уладкавацца першакурснік. Яму гэта ўдалося. Так і пачалося студэнцкае жыццё-быццё на музычным фоне...

Добрай практыкай і заробкам для студэнта была праца ў вакальна-інструментальным ансамблі, які іграў у парку на танцавальнай пляцоўцы, карацей, на Пляцы... Вось там ужо хлопцу хапала ўсяго: музыка гучала, песні спявалі, а дзяўчаты выкрыквалі словы кахання.

Рэдкі вечар абыходзіўся без боек. За імі можна было спакойна назіраць, стоячы на сцэне. Заўжды на танцах было шмат знаёмых. Сумаваць не даводзілася і пасля танцаў: гарадскія прыгажуні насілі на руках.

Валера вылучаўся ростам, чорнымі смалянымі валасамі і спакуслівымі вусамі. Дзяўчаты нярэдка нават рабілі «разборкі» паміж сабою: хто пойдзе з Валерам пасля танцаў?.. Так працягвалася амаль да заканчэння інстытута, пакуль на пятым курсе студэнт-музыкант не ажаніўся перад абаронай дыпломнага праекта, перад размеркаваннем на працу... Хаця якая там магла быць праца, калі «свяціла» служба ў войску.

Са службай хлопцу пашанцавала: трапіў за мяжу, што было цікава і нечакана, дазваляла пабачыць невядомы куток еўрапейскай зямлі...

Да таго ж патрапіў на службу ў асобны ўзвод, дзе было шмат землякоў-беларусаў, нават з аднаго горада. З імі Валера наладзіў добрыя сяброўскія адносіны, бо інакш і не магло быць! Амаль кожны тыдзень ён пісаў жонцы лісты. Здаралася, што і тэлефанаваў, калі выпадала такая магчымасць...

З Валерам Шавейкам Яўген сутыкнуўся нечакана: яны сядзелі побач у салдацкай сталоўцы. Валеру толькі-толькі перавялі служыць у асобны ўзвод з роты аховы. І толькі другі ці трэці раз ён трапіў у батальённую сталовую. Адзін з салдат тым часам няўдала перадаваў яму ў абед бачок з гарачым баршчом і выпадкова перакуліў. Што там адбылося!.. Амаль завязалася б гарачая бойка, калі б не паспелі расцягнуць у розныя бакі.

Так і звярнуў Яўген увагу на новага салдата, запытаў: хто такі?.. І атрымаў у адказ: твой зямляк!..

На пачатку траўня, амаль перад самай дэмабілізацыяй, з Масквы, з Генштаба, прыехаў з праверкай генерал-лейтэнант Убалінс. Высокі, моцнага целаскладу, сур'ёзны мужчына ў ідэальна падагнанай форме ўражваў сваім выглядам. Сапраўдны генерал, ды і толькі.

Яўген за час службы ў Штабе бачыў шмат самых розных генералаў, і сваіх, і маскоўскіх. Быў адзін, які знешнасцю паходзіў на калгаснага брыгадзіра, былога суседа дзядзьку Міколу: невялічкага росту, з чырвоным носам, з прыязнай усмешкаю... Падобнага генерала ніколі не забаішся, а вось такіх як Убалінс... дык і глядзець у іхні бок страшна.

Адразу ж былі падняты па трывозе два танкавыя палкі з канечным выхадам на баявыя пазіцыі на ваенны палігон ў Хаймашкеры. Ноччу прадбачылася баявая трывога і выезд у вучэбны цэнтр.

У вучэбным класе на трэцім паверсе штаба пачалася «вайна»: чарцёжнікі склеілі патрэбную карту, над якой пачалі працаваць два палкоўнікі Аператыўнага ўпраўлення, падключыўшы да справы і Яўгена. Яму, якому заставаліся лічаныя тыдні да звальнення, давялося выконваць дэмбельскую, альбо як за мяжой у савецкім войску гаварылі, «дзямобную», працу.

На вячэру Яўгену яшчэ дазволілі схадзіць, ну а ўжо потым, да ранку, давялося гнуць спіну над картаю, наносячы аператыўныя дадзеныя па руху танкавых батальёнаў да палігона.

Пад ранак у вучэбны клас завітаў прадстаўнік Масквы генерал Убалінс з новым начальнікам Аператыўнага ўпраўлення палкоўнікам Шарбаковым.

— А дзе палкоўнік Гасцюгін? — з парога запытаў Шарбакоў.

— Захварэў!.. — адказаў адзін з афіцэраў.

— А хто аператыўную карту вядзе? — працягваў дапытвацца Шарбакоў.

— Радавы Касцюк!..

— ???

— Салдат, колькі працуеш над картаю? — запытаў начальнік Аператыўнага ўпраўлення ў Яўгена.

— З вечара...

— Дык ты ўжо пэўную ўзнагароду заслужыў за працу! — з непрыязнай усмешкаю сказаў палкоўнік. — Нечарговы водпуск атрымаеш!

— Мне хутка звальняцца ў запас! — адрэагаваў Яўген.

— Шкада... А мо застанешся яшчэ на год вольнанаёмным?.. Створым спрыяльныя ўмовы! — палкоўнік меў нейкі разгублены выгляд. Ён не чакаў ад радавога такой штабной якаснай працы.

Шарбакоў павярнуўся да генерала Убалінса, які разглядваў карту: — Якія далейшыя распараджэнні?

Генерал Убалінс падняў галаву, глянуў на палкоўніка Шарбакова і сказаў:

— Салдату прысвоіць палкоўніка і адправіць на службу ў Маскву, у Генштаб!..

Асобны ўзвод, у якім служыў Яўген, размяшчаўся ў старой драўлянай казарме, якіх у батальёне сувязі было некалькі. Аднапавярховыя, пафарбаваныя ў цёмна-чырвоны колер, падобныя на звычайныя таварныя вагоны, яны былі выцягнутыя ў даўжыню. А мелі ўваходы з абодвух бакоў альбо пасярэдзіне. Жыві, нясі службу ды хадзі ў сталоўку тры разы на дзень...

У Яўгенавай казарме ўваход быў з фасаду. Узвод займаў дзве трэція плошчы будынка. Навокал казармы раслі высокія ліпы, бярозы і клёны. Было відаць, што будынкі старыя, бо калі нехта з салдат ад дрэннага настрою раптам біў нагою па сцяне, дык здавалася, што казарма можа разваліцца.

Гаварылі, што казармы былі тэрмінова пабудаваны пасля восеньскіх падзей у Будапешце ў 1956 годзе — Будапешцкай рэвалюцыі. Яшчэ казалі, што на першых салдат-пасяленцаў у гэтых казармах знянацку ўначы напалі мадзьяры. Шмат нашых хлапчукоў загінула. З таго часу не-не, ды і ўспаміналі ў батальёне пра той выпадак. А калі нехта з салдат губіў пільнасць, дык камандзіры падраздзяленняў напаміналі пра восень 56-га і пра тое, як трэба сябе паводзіць на тэрыторыі братняй дзяржавы...

Аднойчы зімовым вечарам, перад самым адбоем, здарыўся выпадак, які парушыў спакойнае жыццё ўзвода. Пачуліся стрэлы з боку галоўнай вуліцы, дзе знаходзіўся кантрольна-прапускны пункт батальёна. Стрэлы былі падобныя на аўтаматныя чэргі. Хлопцы як па камандзе пападалі на падлогу. Некаторыя нават аказаліся і пад ложкамі. Днявальнаму загадалі выключыць святло.

Была зіма, глыбокі снег. Тыя, хто наважыўся глянуць у акно, мог пабачыць постаці вайскоўцаў, водбліскі агню... Днявальны патэлефанаваў на вузел сувязі, але дзяжурны нічога дакладнага не сказаў.

Днявальны па абавязку службы вымушаны быў «зрабіць вылазку» і разведаць сітуацыю. Пайшоў, аглядваючыся на дзверы, і хутка вярнуўся задаволены, з усмешкаю на твары:

— Пажар у вагончыку будаўнікоў. Нехта пакінуў запаленую цыгарэту, альбо нешта іншае. Шыфер страляе. Дзяжурныя з роты аховы прымаюць меры...

Служба працягвалася. А правільней — блізілася да свайго фінішу. У апошнія паўгода яшчэ больш прыемна было атрымліваць лісты ад родных і сяброў, абмяркоўваць з імі хуткае вяртанне ў бацькоўскі дом. Шкада толькі, не ўсе лісты можна было захаваць: не тыя ўмовы ў войску, тым больш — за мяжою! А так хацелася, так хацелася!..

Сябар-аднакласнік, які служыў у марфлоце, перад звальненнем Яўгена атрымаў чарговы водпуск. Абазначылася магчымасць пабачыцца праз два гады службы. І таму цяпер усе намаганні Яўгена былі накіраваны на тое, каб як мага хутчэй вярнуцца дамоў. У яго сітуацыі заставалася толькі звярнуцца да намесніка начальніка Аператыўнага ўпраўлення штаба.

Палкоўнік Нізоў уважліва выслухаў просьбу салдата і адразу патэлефанаваў генералу Каманенка — начальніку войск сувязі Групы. Той быў не супраць, тым больш што дэмабілізацыя ўжо пачалася.

Калі праз паўгадзіны прапаршчык Казараў накіраваўся з тымі, хто вяртаецца ў Саюз, у краму па дзямобныя падарункі, кампанію перастрэў запыханы прапаршчык Емец з вузла сувязі. Той задаволена-шчаслівы крыкнуў:

— Касцюк, ты заўтра адпраўляешся дамоў!.. — і пабег далей, шчаслівы тым, што менавіта яму генерал даручыў перадаць гэтую навіну...

Палкоўнік Варапаеў, начальнік аператыўнага аддзела, патэ-

лефанаваў у чарцёжку і паклікаў Яўгена да сябе ў кабінет.

— Я выйду на паўгадзіны, а ты прыбяры крыху: прыедуць афіцэры з венгерскага Генштаба. У мяне з імі рабочая сустрэча: трэба як след сустрэць, пакінуць добрае ўражанне: Еўропа. Потым яшчэ ты мне спатрэбішся, далёка не адыходзь.

З начальнікам аператыўнага аддзела Яўген супрацоўнічаў працяглы час, калі так можна сказаць. Палкоўнік цалкам давяраў Яўгену, таму часцяком прасіў працаваць з картамі і рознымі схемамі. Размаўлялі і на простыя жыццёвыя тэмы: пра родных, пра радзіму, пра будучае жыццё.

...Салдат быў у чаканні, і ўжо праз хвіліну пасля таго, як прагучаў тэлефонны званок, быў у кабінеце начальніка.

За сталамі сядзелі венгерскія афіцэры, якія раней вучыліся ў Акадэміі Генштаба ў Маскве, ажыўлена размаўлялі з Варапаевым на рускай мове. Яўген павітаўся, спытаў у палкоўніка:

— Што мне трэба зрабіць, Мікалай Мікалаевіч?..

— Прысядзь пакуль, папі «Кока-колы». Мы яшчэ крыху пагаворым, а калі госці пойдуць, прыбярэш са сталоў.

Афіцэрам захацелася пагаварыць з Яўгенам: іх цікавілі ўражанні ад службы, ад Венгрыі і Будапешта. Ад сустрэчы з Варапаевым у іх быў добры настрой. А калі даведаліся, што Яўген збіраецца пасля службы вучыцца на архітэктара, што яму вельмі падабаецца архітэктура Будапешта і краіны, дык весела загаманілі, выказваючы добрыя пажаданні салдату. Варапаеў ледзь супакоіў іх, паказваючы на гадзіннік. На тым і разышліся, а Яўген пачаў прыбіраць, чакаючы гаспадара кабінета, які абяцаў вярнуцца праз паўгадзіны...

Да Кіева і з Кіева давялося ляцець з трыма хлопцамі-землякамі, якія ўвесь час драмалі, а Яўген не мог нават заплюшчыць вочы. Прызямліліся ў старым аэрапарце: толькі пыл паляцеў ва ўсе бакі. За трое сутак хлопцы былі стомленыя, толькі вочы гарэлі агнём: мы ўжо дома! Пашанцавала і з машынаю: мужчына на службовым УАЗіку падвёз да аўтавакзала, дзе і развіталіся, раз'ехаліся ва ўсе бакі. Яўген на апошні рубель узяў таксі і хутка быў дома.

На другі дзень ён паехаў у процілеглы бок горада перадаць жонцы Валеры Шавейкі пасылку з рэчамі для маленькай дачкі.

Дзверы адчыніла чарнявая дзяўчына ў светлай сукенцы, усміхнулася добразычліваю белазубаю ўсмешкаю. «Нібы мадзьярка-прыгажуня!» — падумаў Яўген, зачараваны дзявочай прыгажосцю.

— А Наталля дома? — запытаў.

— Праходзьце! Я пра вас ведаю! А Наталля чакае ўжо з учарашняга дня!..

На ўтульнай верандзе дома стаяла ў чаканні Яўгена маладая светлавалосая жанчына з дзіцём на руках. Яна адразу запрасіла прысесці на канапу, а сама хуценька знікла...

— А як вас называць, шаноўная пані?!. — весела запытаў Яўген у дзяўчыны, якая аказалася сястрой Валерыя. — Валера мне гаварыў пра вас, але імя не называў. Пэўна, не хацеў, каб я ведаў!..

— Ён добры брат! — усміхнулася Святлана, сядаючы насупраць Яўгена. Яе доўгія смаляныя валасы цяжка ляжалі на аголеных плячах. — А я заканчваю школу. Буду паступаць у інстытут: той, дзе вучыўся брат.

— Вось там і будзем сустракацца! — весела адказаў Яўген і глянуў на Наталлю, якая з'явілася ў дзвярах з бутэлькаю шампанскага, талеркаю з бутэрбродамі і цукеркамі.

— Уладкоўвайся добра, зараз адзначым тваё вяртанне. Дзякуй, што так хутка прыйшоў з пасылкаю. Вы, пэўна, ужо пазнаёміліся: гэта Святлана, сятра майго мужа. Добрая дзяўчына, раю вам пасябраваць!..

— Поўнасцю згодны. Асабліва, калі табе дарагое тое, чаго чакаеш... Наталля, а я цябе памятаю па Пляцы! — Яўген уважліва глядзеў на жонку Валерыя-музыканта.

Ён адразу пазнаў яе, калі толькі пабачыў. І адразу нешта прыемна-салодкае кальнула пад сэрцам: дыхнула веснавым паветрам тых незабыўных вечароў у парку. Яна спадабалася яму адразу, як толькі ўпершыню запрасіла на танец...

Мінула больш за два месяцы пасля вяртання Яўгена з войска. Пачаліся ўступныя экзамены ў інстытуце. Паспяхова быў здадзены першы: вынікі вывесілі пад вечар на дошцы для аб'яў. З двума новымі знаёмымі Яўген паехаў у цэнтр горада прагуляцца. Потым пацягнула на Пляц: хацелася зняць напружанне. Гэта ўдалося, бо сустрэў знаёмых дзяўчат-сяброўак...

Калі пасля танцаў ужо набліжаліся да цэнтральнай вуліцы, то ззаду пачуўся гул легкавой машыны: то была міліцэйская, з капітанам за рулём. Яўген з сяброўкамі крыху адышлі ўбок. Капітан спыніў машыну:

— Чаму дарогу не саступаеце міліцыі?!. — пагрозліва выкрыкнуў кіроўца з акруглым, чырвонага колеру тварам.

— Дык на спіне вачэй няма! Ды і можна было не спяшацца ехаць праз натоўп! — у добрым настроі з усмешкай адказаў Яўген.

— Не трэба было з ім размаўляць! — заўважыла светлавалосая Валянціна і дадала: — Вось пабачыш, будзе чакаць наперадзе! Я іх ведаю, служак!..

— А я адвык ад іх за два гады ў войску! Венгерскія паліцыянты паважаюць мясцовых. Там у паліцыю выбіраюць лепшых!

— То там! А ў нас зусім па-іншаму! — дадала Таццяна, якая ўвесь гэты час маўчала.

— А вось і машына! — упаўголаса прагаварыла Валянціна.

Капітан ужо чакаў Яўгена, які так непаважліва аднёсся да заўвагі.

— Сядай у машыну! Паедзем у аддзяленне для размовы! — выкрыкнуў міліцыянт, накіроўваючыся да Яўгена і яго кампаніі.

— Не бачыш, што я заняты! — весела адказаў хлопец, асабліва не звяртаючы ўвагі на словы капітана. — Я трэці дзень як з войска, а ты турбуеш мяне невядома чаго. Займіся лепш больш патрэбнай справай!

— Сядай у машыну! — яшчэ больш пагрозліва скамандаваў капітан і схапіў Яўгена за локаць.

— О-о!!! Гэта ўжо перавышэнне ўлады! — Яўген крутнуўся і вызваліў руку. — Вось зараз тут не хапае твайго начальніка. Няхай бы пабачыў, як ты сябе паводзіш!

Капітан накінуўся на Яўгена, нібыта каршак на здабычу. Далейшае развіццё падзей не абяцала нічога добрага.

— Згодны, едзем! Толькі да аператыўнага дзяжурнага: хай выклікае тваё начальства і разбіраюцца з табою! — Яўген ледзь стрымліваў сябе. Паступленне ў інстытут... Усё магло накрыцца «медным тазікам». Ды і ўвогуле, пэўны досвед у яго ўжо быў.

Дзяжурны міліцыянер адвёў Яўгена ў памяшканне часовага затрымання, дзе ўжо знаходзілася некалькі чалавек рознага ўзросту.

Хлопец зняў плашч, паклаў ля сцяны на вольнае месца на драўляным узвышэнні, падобным на сцэну Пляца, прылёг супакоіцца і крыху адпачыць, наколькі гэта магчыма ў ягоным выпадку.

...Зранку нейкі старшы лейтэнант павёз Яўгена ў суд, які размяшчаўся недалёка ад гарадскога аддзялення міліцыі. Суддзя быў адзін у невялікай зале, куды амаль адразу зайшоў і капітан-сусед, які пачаў распранацца, дэманструючы нібыта пастаўленыя Яўгенам сінякі.

— Нічога падобнага не было! Ніякай бойкі! Я ішоў з дзяўчатамі з танцаў, пакуль капітан не прыпыніўся і не прапанаваў праехаць у аддзяленне. — Яўген стараўся гаварыць спакойна, хоць у душы кіпела.

Суддзя, чалавек гадоў пяцідзесяці, спыніў свой погляд на міліцыянце:

— Усё залежыць ад вас: абмяжуемся папярэджаннем ці дамо па поўнай.

— Таварыш капітан, — Яўген нечакана звярнуўся да міліцыянта «па форме», — прабачце за ўчарашнее: не стрымаўся! Больш ніколі не буду ўступаць у спрэчкі з міліцыяй! Мне неабходна рыхтавацца да экзаменаў.

Капітан, зважаючы на такі паварот справы, паблажліва прагаварыў:

— Таварыш суддзя, хай здае свае экзамены! Не будзем пакуль псаваць майму «хросніку» настрой!.. Хай жыве!..

Атрымаўшы штраф у дваццаць пяць савецкіх рублёў, Яўген пайшоў дамоў адпачываць і рыхтавацца да наступнага экзамена... Грошы давялося пазычаць, каб маці не даведалася пра здарэнне.

...Кастрычніцкай раніцай, паснедаўшы, сівавалосы мужчына з добрым настроем сеў за камп'ютар. У яго ўжо ўвайшло ў звычку рабочы дзень маладога пенсіянера пачынаць з працы за камп'ютарам: праглядаў навіны, нешта друкаваў. То была, так бы мовіць, ранішняя зарадка-размінка. Асабліва спяшацца куды-небудзь на пачатку дня не даводзілася: абавязковыя справы ў архітэктурным бюро чакаліся бліжэй да абеду.

Так, ён нядаўна, больш за год ужо як стаў пенсіянерам: паспеў «ускочыць» у апошні вагон пенсійнага цягніка, як і жонка Святлана...

Нечакана ўвагу Яўгена Іванавіча зацікавіла звестка пра шасцідзесяцігоддзе падзей у Будапешце. Так, гэта было ў кастрычніку 1956 года. У апошні дзень месяца дэманстранты акружылі будынак будапешцкага гаркама партыі, які лічыўся аплотам кансерватараў. Спачатку яны хацелі толькі «разагнаць сталіністаў». Але нечакана пачаліся стрэлы, на пляцы з'явіліся параненыя і забітыя. Раз'юшаны натоўп уварваўся ў гаркам і расправіўся з дваццаццю камуністамі, у тым ліку і з першым сакратаром Імрэ Мезе.

Па ўсім Будапешце пачалі лавіць і вешаць на дрэвах афіцэраў дзяржбяспекі, якіх пазнавалі па аднолькавых жоўтых ботах, якія тады выдавалі ў гаспадарчым упраўленні. Гэтыя падзеі ўстрывожылі Маскву. Але хто тады даў каманду страляць, невядома і да гэтага часу. Па некаторых дадзеных, правакацыю ўчынілі венгерскія чэкісты. Ад такіх службоўцаў усяго можна было чакаць. Узброеныя сілы Савецкага Саюза былі прыведзены ў поўную баявую гатоўнасць: баяліся, што за Венгрыю заступяцца заходнія дзяржавы. Кіраўніцтва СССР не выключала прымяненне ядзернай зброі, але гэта азначала б пачатак Трэцяй сусветнай вайны... У адрозненне ад «Пражскай вясны» 1968 года, венгерскія падзеі не абыйшліся без баёў і крыві. Маршал Іван Конеў прымяніў тую ж тактыку, што і пры штурме Берліна ў 1945-м: кінуў на вузкія вулачкі вялікага горада вялікую колькасць танкаў. Абаронцы Будапешта закідвалі іх «кактэйлямі Молатава» і абстрэльвалі з верхніх паверхаў будынкаў. За тры дні загінулі 2652 венгры і 640 савецкіх ваеннаслужачых, было многа параненых. Дваццаці шасці савецкім афіцэрам і салдатам за ўдзел у неабвешчанай вайне было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Больш за 800 чалавек вывезлі ў савецкія лагеры і турмы, каля 13 тысяч кінулі ў палон на радзіме. Цікава, што ні адзін венгерскі салдат у час памятных падзей не перайшоў на савецкі бок...

Пасля прачытанага згадалася Яўгену Іванавічу і жнівеньская падзея 68-га: Прага, Чэхаславакія. На той момант быў на канікулах у вёсцы ў дзеда з бабуляю. І калі пачалі ляцець цяжкія савецкія самалёты ў адным накірунку, вяскоўцы захваляваліся: нешта здарылася сур'ёзнае. Ім прыпомніўся 41-ы, пачатак вайны. Тады, у 68-м, пачалі браць былых вайскоўцаў у «партызаны». Паціху даведаліся людзі пра падзеі ў Чэхаславакіі — у асноўным з радыё і газет, з рэдкіх у людзей тэлевізараў. Інфармацыя давалася тая, дзяржаўная, а значыць, не зусім поўная і дакладная. Такая, якая была патрэбная кіраўніцтву савецкай дзяржавы.

Мужчына разглядваў фотаздымкі, чытаў тэксты. Да драбніц прыпомнілася тэрміновая служба ў Венгрыі, у Будапешце. Пашанцавала: трапіў у Еўропу праз жалезную заслону. Апынуўся, можна сказаць, у іншым свеце. Прыгадаліся светлыя і цёмныя бакі той службы... Многа давялося пабачыць і перажыць. Ды толькі ў маладым узросце ўсё пераносілася лёгка, без асаблівай напругі. Каб яшчэ не сум па родным доме.

Звальняўся ў 76-м мінулага стагоддзя, чатыры дзясяткі гадоў прайшло. Як хутка прабег час, як шмат чаго памянялася...

Вярнуўся са службы, паступіў у інстытут на любімую спецыяльнасць. Але заўжды трымаў у сэрцы памяць пра службу ў Венгрыі. А перад вачыма на сцяне ў пакоі нязменна вісіць каляровы партрэт знакамітага венгерскага паэта Шандара Пэтэфі, сімвала нацыі, які з шабляю ў руцэ загінуў ад кап'я расійскага казака ў час вызваленчай барацьбы за незалежнасць краіны ў сярэдзіне дзевятнаццатага стагоддзя. Пад яго засяроджаным поглядам і пражыў ужо больш за сорак гадоў...

А калі ў святочныя дні ў парку гучала музыка, дык прыпамінаўся Пляц, які пакінуў асаблівы след з гадоў маладосці і сама назва якога нясе глыбокі сэнс.



2016 г.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 8 (132) | 25 жніўня 2017 | № 31 (545) Новы час

Кракаўскі ровар

Андрэй ХАДАНОВІЧ

Новая Гута. Пралог

Ляцеў праз Ціхі акіян,
заблытаўся ў чужой валюце.
Хацеў у Новы Арлеан,
а прызямліўся ў Новай Гуце.

Кракаў. Музей Manggha

Звіняць званы на Вавелі,
ўпадае Вісла ў кому...
Што ў піва мне дабавілі,
не раскажу нікому.

Звіняць на Вавелі званы,
даўно пара з музею.
А экспанат — такі п'яны,
што Вісла цверазее.

Планты. Завея. Канец красавіка

У Кракаве бэз, дзьмухаўцы і цюльпаны,
і лавачка ў гонар Рамэна Гары.
А я на той лаўцы драмаю, заспаны,
і бабка-бамжыха мне кажа: «Стары...».

У Кракаве снегам заносіць каштаны,
засыпала бэз, замяло дзьмухаўцы.
А я ў той завеі лячу, апантаны,
і бабка-бамжыха гаворыць: «Капцы...».

* * *

Цёплыя падворкі
выпілі дажджы.
Распускаюць пёркі
лярвы і бамжы.

Птушачкі-малечы
гадзяць на дзятву,
але ўсё на плечы,
не на галаву.

За акном паненкі
ладзяць саўндчэк.
Кашляе з-за сценкі
перакладчык-чэх.

Бо даўно старога
муза б'е па лбе...
Пачакай нямнога,
прыйдзе й да цябе.

Рынак. Мар'яцкі сабор

Кракаўскія галубы
побач з Мар'яцкім саборам
затуркаталі хорам:
«Больш не трэба трубы!»
А гракі ўсчалі грай:
«Грай, гэйнал, грай!»

Рынак. Помнік Міцкевічу

Ты асцярожней, стары,
з рыфмай, півам і кпінамі:
класікі бачаць згары —
вечназялёнымі спінамі.

Планты. Помнік Крэўскай уніі

Ля помніка ў гонар хаўрусу
між Польшчаю і Літвою
віленскі дзед беларусу
кіўнуў сівой галавою.

Шклянку дастаў з кішэні.
Скардзіцца, што херова:
кепскае спалучэнне —
«швітурыс» і «выбарова».

«Вяселле». Кінатэатр «Кіеў»

Анджэю Вайду

У кіно, на бясплатным сеансе,
афрыканец-турыст плача ў трансе:
«Прапілі край, свабоду і сцяг...
Але Польшча... б'ецца ў грудзях».



Андрэй Хадановіч

Персідская ружа. Пляц Шчэпаньскі

П'яны скінхэд з марозівам:
шчасце цячэ
з вачэй.
Не апісаць у прозе вам.
Вершам — яшчэ
лягчэй.

Вуліца Крупніча, 22

Дзе паэт-хірамант падшафэ
зачароўваў вазніцу і дрожкі,
сёння ў модным веганскім кафэ
п'юць-ядуць... і не смачна ні трошкі.

Такса. Вуліца Дзітля

Левы бот абсікала такса.
Гаспадар папрасіў паўбакса.
Я даю беларускі «рэ».
Не бярэ.

* * *

Забыўшы пра печань і печаю,
аслеп ад красы юных полек —
і клеіў іх скочам, старэнькі П'ю,
амонімны алкаголік.

Майскія

Кракаўскія вальпургіі лётаюць
на парасонах.
Хто завітаў апрануты,
выйдзе ў адных кальсонах.

Хочаце зведаць вечнасць
за адзін эпізод,
выглядаць на пятнаццаць,
маючы ўсе пяцьсот?

Дык не праходзьце міма,
кракаўскай Малгажатаю
спакушаюцца майстар
і вагонаважатая.

Ёсць тры ночы на шабаш —
і гудуць малайчыны...
Перш чым прыйдуць да Бога,
Гонару і Айчыны.

30 красавіка — 3 траўня

Казімеж. Страшылкі

1.
Няверны каханак шукаў
уначы банкамат.
Прыватны агент на каханка
шукаў кампрамат.
Штось фоткаў... Ахоўнік-гэбіст
не шукаў яго стужку,
а ўсіх наматаў на вінтажную
фотакатушку.

2.
Два бамжы за булку б'юцца
ля прытулку...
Шызая галубка выхапіла булку.
Кулакоў — чатыры,
сківіцаў — чатыры...
Бедны сімвал міру, супакойся ў міры!

Кракаўскі мінімалізм

На вуліцы Святога Станіслава
я п'ю ваду Святога Станіслава.

Бабулька па суседстве кліча ўнучку,
а іншая бабуля кліча сучку.

Абедзвюх, уявіце, клічуць Стася...
Здаецца, мая раніца ўдалася.

* * *

Так чхаю — аж чуваць
за сценкаю суседцы,
што кажа: «Будзь здароў!» —
у сацыяльнай сетцы.

* * *

Не апошні дармаед неба і зямлі,
віртуальных салаўёў кормячы
tut.байкамі,
паляваў на сэрцы... Многія былі
абы-як пастаўленымі лайкамі.

* * *

У Кракаве, на шумным пляжы Багры,
разбэшчаны народ шалее без Віягры.
Пад Скаламі ж Твардоўскага —
блакітна і празрыста:
відаць, як вадзянік схапіў аквалангіста.

Кракаўскі ровар

(Дарослая версія)

Помні, турыст-паэт —
горшы за проста турыста!
Так заслухаўся спевам
з музычнай школы,
што пайшоў на чырвонае й
збіў раварыста —
дзядзечка паляцеў трамваю пад колы.

Добра, кіроўца трамвая
не слухаў спеў.
Затармазіць паспеў.

Раварыст засадзіў у вуха,
сам атрымаў па шыі.
Разам пайшлі на піва.
Усё-такі ж не чужыя.

Думаў, усё абышлося. Насамрэч — не.
Бо ў паэта цяпер штоночы ровары ў сне.

Сніць, што ў дзіцячым садку
на ровар трохколы
сеў і наехаў на нянечку.
Тыдзень без пепсі-колы.

Сніць, быццам дзень народзінаў.
Падарункі — акей.
Паабяцалі ровар.
Купілі настольны хакей.

Сніць, што падвозіць суседку —
і ўсё на мазі.
Цемра. Канава. Крыкі:
«Не тармазі, тармазі!».

Сніць Амстэрдам з чырвонымі
ліхтарамі.
Едзе паўз прыгажуняў,
а сам — дзяўчынка на раме.

Сніць, што заехаў у лес,
папругай падперазаны.
Ён акупант. Напярэймы яму —
партызаны.

Сніць, што наперад
выраваўся ў велагонцы:
вецер гудзе ўвушшу,
спіцы блішчаць на сонцы,

ды перад самым фінішам —
хтосьці пад колы,
зачараваны спевам з музычнай школы.

Самакат

(Дзіцячая версія)

Мама, дагані
Супер-самакат!
Правілы гульні —
Хутка й наўздагад!

Ты давай бягом,
Я ж палёт люблю:
Адштурхну наском
Ад сябе зямлю.

Я магу без рук,
Вунь да тых алей!
Упаду на брук —
І лячу далей.

Тармазоў няма,
Толькі ветру свіст.
Ад мяне дарма
Уцякаў турыст.

Мой жалезны конь,
Я на ім — казак.
У драпінах далонь,
На ілбе гузак.

Хай нагу нацёр,
Гонячы балід, —
Быў я каскадзёр,
А не інвалід.

Сонца ў вышыні.
Травень уваччу.
Мама, дагані!
Я яшчэ хачу!

Красавік–чэрвень 2017, Кракаў

Сваяк

(Словы пра мастака Толю Александровіча)



Адам ГЛОБУС

Паста з гуталінам

Толя Александровіч расказваў, як яму ў дзяцінстве хацелася маляваць фарбамі, навыцісканымі з цюбікаў. У сапраўдных мастакоў, на думку пяцікласніка, фарбы павінны захоўвацца ў цюбіках, а не ў баначках і ванначках. У нашым Койданаве такіх фарбаў не прадавалі, таму Толя ўзяў у работу цюбікі з зубной пастай і цюбікі з гуталінам. Паста была белая і салатная, «Памарын» і «Лясная». Гуталін быў чорны і брунатны. Гэткімі «фарбамі» Толя напісаў на кардонцы, выразанай са скрыні для абутку, партрэт суседскага сабакі Арсіка. Сабака атрымаўся падобны, нават вочы ў яго паблісквалі так, нібыта яны жывыя. Карціна, створаная з пасты і гуталіна, пражыла не вельмі доўга, яна хутка высахла, пасівела і паабсыпалася, але першая гульня ў дарослага мастака ў Толі Александровіча атрымалася на выдатна.

Капейкі

Бацькі кожную нядзелю давалі Толю дзесяць рублёў. З дзясяткай ён ехаў з Койданава ў Мінск, дзе займаўся ў мастацкай вучэльні. Пакуль Толя хадзіў у вучэльню і інстытут, ён жыў у кватэры маіх бацькоў. Разам з Толям я пражыў у адным пакоі восем гадоў. Гэта шмат, калі прыняць той факт, што найлепшае ў чалавека — дзяцінства. Калі Толя меў штотыднёвыя дзесяць рублёў і штомесячную васямнаццацірублёвую стыпендыю, дык мне давалі ў школу пятнаццаць капеек на дзень. Даводзілася падзарабляць. Я збіраў і здаваў бутэлькі, хадзіў па крамах па пакупкі, каб пакінуць сабе капеечную рэшту. Грошы ў мяне — школьніка — былі заўсёды. У Толі яны часцяком у чацьвер ці пятніцу скончаліся. Ён пазычаў у мяне рубель ці пяцьдзясят-семдзесят капеек, абяцаў у панядзелак вярнуць. У панядзелак пазыка пераносілася на наступны тыдзень. Толя большасць з пазык не вярнуў. Мне іх не шкада. Звычайна, у мяне вялікія праблемы з людзьмі, якія не вяртаюць грошы; а тут ну зусім не шкада тых папазычаных капеек і рублёў.

Высоцкі


У свае студэнскія часы скульптар Вова Жбанаў быў вясёлым Санча Панса з Цівалёў пры Дон Кіхоце з Койданава, пры графіку Толю Александровічу. Яны былі вясёлай парай, яны былі любімцамі тэатральна-мастацкай публікі. Яны захапляліся тэатрам і кіно. Яны так любілі кіно і кінаартыстаў, што паехалі ў Маскву знаёміцца з Уладзімірам Высоцкім. Яны нават пазнаёміліся з народным кумірам — Сымонавічам. Падыйшлі да яго і пазнаёміліся. Ён папрасіў хлопцаў злётаць у гастраном па віно. Яны прынеслі бутэльку. Высоцкі правёў іх за сцэну. Вова і Толя прастаялі за сцэнаю ўвесь спектакль. Яны пратрымалі бутэльку ў руках увесь час, пакуль ішла п'еса. Пасля Высоцкі выпіў са Жбанавым і Александровічам. Выпіў і развітаўся. Апавяданне пра падарожжа ў Маскву і знаёмства з Высоцкім я выслухаў разоў са сто, а можа і больш. Я выслухаў гісторыю і ад Толі Александровіча, і ад Вовы Жбанава. Я так наслухаўся пра непараўнальнага Сымонавіча, што на нейкі час узненавідзеў Высоцкага. Калі той памёр, я быў якраз у Маскве, праходзіў пераддыпломную практыку ў Строганаўскай вучэльні, але на пахаванне не пайшоў. І Жбанаў, і Александровіч, і шмат хто, вельмі здзівіліся, што я быў у Маскве, калі хавалі Сымонавіча, але не пайшоў з ім развітвацца. Не мой ён герой. Не мой. Чужы. Толя Александровіч і Вова Жбанаў — мае героі.

KINO

«KINO» — польскі часопіс, што прадаваўся ў мінскіх «саюздрукаўскіх» кіёсках за савецкім часам. Каб набыць часопіс, трэба было прыходзіць раніцай пад адкрыццё кіёска і ведаць дзень, калі часопіс прывязуць. Яшчэ варта было мець папярэднюю дамову з кіяскёршай, каб яна не выставіла «KINO» на вітрыну, бо нехта іншы мог схапіць каштоўны часопіс. «KINO» прадавалася па блаце. Блат меў Толя Александровіч, калі Толі не было ў Мінску, я хадзіў у шапік каля кінатэатра «Перамога» і выкупляў чарговы нумар. Чорна-белыя здымкі друкаваліся аксамітнай фарбаю. Яны здзіўлялі кантрастамі і глыбінёй. Толькі самыя каштоўныя здымкі там былі вялікія каляровыя і з аголенымі акторкамі. У імперыі, дзе эротыка і парнаграфія жылі пад забаронай, мець фота з аголенымі кінадзівамі было сапраўднай раскошай. Яны радавалі, яны абуджалі пажаду, яны клікалі ў свет эратычных насалодаў. Яны былі тымі ўзорамі мастацтва, якія моцна паўплывалі на пакаленне маіх раўналеткаў і пакаленне старэйшых братоў. За што мы ўсе і ўдзячныя польскаму часопісу «KINO».

Таемны партрэт

У розны час самыя розныя віды мастацтваў робяцца моднымі ў шырокіх народных масах. Бывае, што народ захопіцца керамікай, збірае розны посуд і гліняных чорцікаў з конікамі. Здараецца, што захапленне крышталём робіцца татальным. На нейкі час акварэльныя краявіды ў светлых рамах таксама зрабіліся модна-народнымі. Зрэшты, у кожнай лаўцы з сувенірамі народна-моднага мастацтва поўныя паліцы і вітрыны... Быў час, калі моднай зрабілася чаканка. Ледзь не ў кожнай кватэры над часопісным столікам каля таршэра вісела металічная дзяўчына з металічным сонцам. Мастакі спрабавалі патрафляць у народны густ і пастуквалі ды пастуквалі па латунных пласцінах. Што толькі не вычаканьвалася на тонкім метале? Львы, сабакі, каты, аголеныя дзявулі, ягіпецкія багі, сонцы з месяцамі... Толя Александровіч вычаканіў партрэт свайго куміра — Уладзіміра Сымонавіча Высоцкага з сямістраннай гітарай. Чаканнага Высоцкага ён змясціў у шырокую раму з дошак, апрацаваных паяльнай лямпаю і лакам. Такая апрацоўка дошак тады называлася «Ворагі спалілі родную хату». Чаканны Уладзімір Высоцкі вісеў на гарышчы ў койданаўскім доме Александровічаў. Толькі вельмі блізкія да Анатоля людзі маглі палюбавацца шэдэўрам. Напэўна, і цяпер той партрэт усё яшчэ вісць на гарышчы ў койданаўскім доме, што стаіць на вуліцы Чапаева.



Пятроў-Водкін і Саламаткін

Толік прыйшоў дамоў у кепскім настроі. «Што?» — пытаюся. «Не здаў іспыт па расійскаму мастацтву. Не змог адказаць». — «Пераздасі». — «Канечне пераздам. Крыўдна, што адно пытанне з трох я добра ведаў. Трэцяе пытанне было пра творчасць Пятрова-Водкіна. Я ж яго выдатна ведаю, і «Чырвонага каня», і «Смерць камісара». Першае пытанне было пра гурток «перасоўнікаў». Таксама можна было нешта нагаварыць. Але я прагараў на другім пытанні пра мастака Саламаткіна. Пра такога я першы раз на іспыце і даведаўся. Яго прозвішча пішацца ў адно слова — Саламаткін. А я прачытаў ў два — Сала-Маткін. Мяне ўзяў смех. Спрабую нешта казаць — і не магу. У галаве толькі Сала-Маткін і Пятроў-Водкін... Эльмарт Адэльбертавіч Петэрсон мяне з іспыта выгнаў». Чамусьці мне было не смешна, бо я падумаў, што Толя жартуе з мяне, бо не можа быць мастака з такім брыдкім прозвішчам, як Сала-Маткін. Толю нават давялося мне паказваць сваю залікоўку, дзе не было адзнакі па расійскім мастацтве. Каб яшчэ больш не растройваць старэйшага чалавека, я нават зрабіў выгляд, нібыта паверыў у існаванне Сала-Маткіна. Толькі па-сапраўднаму паверыў я ў яго існаванне на наступны дзень, калі ў бібліятэцы прачытаў энцыклапедычны артыкул пра расійскага жывапісца-перасоўніка Леаніда Саламаткіна.

Бондар і званы

У літфункцыянеркі Тасі Бондар меўся ўлюбёны выраз: трэба біць у званы. Трэба біць у званы, бо культура гіне. Трэба біць у званы, бо руйнуецца архітэктура! Трэба біць у званы, бо гіне цывілізацыя!!! Бондар гаварыла гучна, гаварыла раскацістым голасам, у нечым падобным да груганавага. Тасю было чуваць здалёк. Яе змаганства за цывілізацыю, насамрэч, было пустазвонным. Дзякуючы папуліцкім выказванням і нахабнаму імпэту, Тася замацоўвала сябе ў структуру дзяржаўнай машыны. Бондар прагла ўлады, а калі яе атрымлівала, паводзіла сябе з падначаленымі жорстка. Аднаго разу я прысутнічаў на абмеркаванні малюнкаў, зробленых для аздаблення часопіса «Беларусь». Малюнкі тыя зрабіў Толя Александровіч. Тэхнічны рэдактар няправільна разлічыў колькасць тэксту на старонцы, і адзін з малюнкаў атрымаўся завялікі. Бондар схапіла малюнак і адарвала палову. Рваць чужы твор напалам яна лічыла цалкам нармальным і натуральным у сваім працоўным працэсе. Толя збялеў сцяўся, сагнуўся, але не выказаў абурэння варварскімі паводзінамі Тасі Бондар. Я сказаў, што варта было паменшыць шрыфт і крыху скараціць тэкст, а не рваць добры малюнак. На шта Бондар парыравала: «Я крыху скараціла малюнак!» А каб зняць гнятлівае напружанне, яна высока ўскінула сваю вяліканосую галаву і зарагатала.

Свет

Памёр Толя Александровіч (06.01.1953–26.05.2017). З ім я пражыў у адным пакоі цэлых восем доўгіх, якія бываюць толькі ў дзяцінстве, гадоў. Ён быў для мяне старэйшым братам і настаўнікам у свеце мастацтва. Дзякуючы яму я паступіў у мастацкую вучэльню і стаў прафесійным мастаком. Без яго свет стаў горшым.

Яны так любілі кіно і кінаартыстаў, што паехалі ў Маскву знаёміцца з Уладзімірам Высоцкім. Яны нават пазнаёміліся з народным кумірам — Сымонавічам. Падыйшлі да яго і пазнаёміліся. Ён папрасіў хлопцаў злётаць у гастраном па віно. Яны прынеслі бутэльку. Высоцкі правёў іх за сцэну

Маці

За адзін тыдзень некалькі разоў у мае сны прыходзіла нябожчыца маці. Двойчы яна з'яўлялася разам з бацькам. Нешта казала, нешта паказвала ў нейкім часопісе. Прачнуўшыся, я не мог згадаць іх словы, не мог прыгадаць і паказанае ў часопісе. Так здараецца, што ты спрабуеш згадаць сон цалкам, а ён помніцца адно фрагментамі. Маці хацела папярэдзіць мяне. Калі пабачыў белы матчын твар, з якога цяклі чорныя слёзы, я нават спалохаўся. Слёзы цяклі не з яе блакітных вачэй, а цяклі яны са шчок пад вачыма. Густыя, як нафта, слёзы пакідалі на бялюткім твары чорныя рагі... Была ў мяне здагадка, што нябожчыкі прыйшлі па некага мне блізкага, прыйшлі, каб забраць да сябе нашага сваяка. І ўсё адно, прачытаўшы чорную навіну пра смерць Толі Александровіча, я гучна на ўсю майстэрню сказаў: «Не!»

Шапкі

Толя любіў стыльныя шапкі. У мастацкую вучэльню ён хадзіў у брунатнай вельветавай фуражцы з чорным лакіраваным брылём. Тую стыльную фуражку яму сяброўкі прывезлі з Тарту. У студэнтаў тамтэйшага ўніверсітэта былі, ці не ў адзіных на ўсю імперыю, форменныя фуражкі. На пачатку семідзесятых гадоў гэтыя прасценькія фуражкі лічыліся ў маладых людзей самымі моднымі з мужчынскіх галаўных убораў. Такая ж брунатная фуражка была і ў Вовы Жбанава, я пра падобную раскошу на галаве нават марыць не наважваўся. Апошні раз я бачыў Толю ў чорнай вязанай шапцы. Падумалася, што шапка простая, але цёплая і стыльная. Яшчэ падумалася, што ў наступную нашу сустрэчу мы абавязкова спынімся і загаворым. Мы ж не ведалі, што бачымся ў апошні раз. Не ведаю, пра што падумаў Толя ў час нашай апошняй выпадковай сустрэчы каля крамы «Акадэмкніга», а я падумаў пра цёплую шапку.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 8 (132) | 25 жніўня 2017 | № 31 (545) Новы Час

Пташнікаў

Андрэй ФЕДАРЭНКА

— Я тройчы сталічны чалавек, — казаў ён. — Нарадзіўся ў Плешчаніцах, вучыўся ў Лагойску, жыву ў Мінску; а так як у Беларусі тры сталіцы: Мінск, Лагойск і Плешчаніцы, то…

Да вайны ён паспеў скончыць тры класы пачатковай школы. Потым — вайна, блакада, хаванне ад немцаў па лясах і балотах, голад, холад (у 2002 годзе я пачуў ад Ніла Гілевіча, што «Пташнікаў амаль усё жыццё з адной ныркай», — несумненна, вынік таго ліхалецця). Далей біяграфія даволі роўная: з сярэбраным медалём закончыў школу, журфак, рэдактарская праца.

Чым ён цікавіўся, акрамя літаратуры і прыроды? Наколькі памятаю, ён не быў ні рыбаком, ні грыбовікам, ні паляўнічым; праўда, яго неаднойчы бачылі на чыгуначным вакзале ў дажджавіку і з заплечнікам, але, хутчэй за ўсё, ён проста ездзіў пабыць сам-насам з любімай прыродай. «Як распавядаў празаік Анатоль Казлоў, — пісаў Ціхан Чарнякевіч, — Пташнікаў раіў «неафітам», якія неслі ў «Полымя» свае першыя творы, пачынаць з апісальнай тэхнікі: сядаць у лесе ці ў лузе ці папросту на траву ля дома і апісваць тое, што бачыш — як мага больш падрабязна й дакладна фіксаваць найменшыя зрухі быцця».

Не любіў кампаній і чарак. Абыякавы быў да спорту… Раз стаяў, задуменны, каля вакна ў рэдакцыі, барабаніў пальцамі па папцы з чужымі рукапісамі.

— Пра што вы думаеце, Іван Мікалаевіч?

— Пра Анжаліку Варум. Якое дзіўнае прозвішча — чаму. І не такая яна ўжо таленавітая, як з ёю носяцца.

— Ува мне памёр вялікі нерэалізаваны вандроўнік, — казаў у другі раз. — Так я люблю дарогу, новыя мясціны — і нідзе не быў! Адзін раз у жыцці ездзіў за мяжу, у Беласток, на два тыдні, потым раман хацеў пра гэта пісаць…

Уладзімір Дамашэвіч у рамане «Камень з гары» вывеў яго пад прозвішчам Драздоў.

«Здаецца, не чытаеш, а бачыш малюнак — так ён мог перадаць прыроду. Часам гэтым сваім умельствам Драздоў злоўжываў, і прырода паглынала чалавека, як вялікі лес».

Я б яшчэ дадаў — прырода ў яго творах часта не толькі паглынае герояў, а ўвогуле як бы існуе асобна ад іх. Такое адчуванне, што яму зусім няважна, чыімі вачыма яе апісваць: партызана ці паліцая, падперазанага пілою леспрамгасаўца, вясковага шафёра ў мазутнай «фуфайцы», капітана энкавэдэ Дувалава ці мінскага летуценнага паэта.

Ён не заўсёды паспявае за сваімі героямі. Яны як бы ідуць сваёй дарогай, а аўтар — сваёй: то збоку, то ззаду, увесь час затрымліваючыся, каб апісаць яшчэ іншымі фарбамі пейзаж, кветку або птушку. У яго занадта роўны, запаволены і ад таго крыху аднастайны стыль, які ўмоўна можна назваць «рэтраспектыўным» — гэта калі героі знаходзяцца ў цяперашнім часе, а падзеі адбываюцца ў мінулым (адзін з любімых яго прыёмаў, напрыклад, такі: «Падае снег. Падаў ён і тады, калі…»).



Іван Пташнікаў. Фота з архіва «Мастацкай літаратуры»

Затое там, дзе героі і прырода па шчаслівай выпадковасці супадаюць, атрымліваюцца такія рэчы, як «Лонва», — на маю думку, самая лепшая яго аповесць. Галоўны герой — таксатар, чалавек, праца якога звязана з лесам, з прыродай, таму любыя адступленні на гэтую тэму натуральныя і дарэчныя.

«Лонва» нечым нагадвае «Людзей на балоце». А можа, і не нечым, а пісалася пад яўным уплывам вялікага рамана. «Людзі на балоце» надрукаваны ў «Полымі» ў 1961-м, «Лонва» — у тым жа «Полымі» ў 1964-м, гераіню «Лонвы» Жэньку дражняць Чарнушка, нават пачаткі падобныя: «Хаты стаялі на востраве» — у Мележа; «Яны доўга стаялі на шашы» — у Пташнікава.

Тут ён цалкам у сваёй стыхіі. Жнівень, вечар, вясковы двор, туман, камарыны звон, вогнік, каля якога двое, на цаглінках у чыгуначку варыцца бульба, і плаўна цячэ апавяданне — не так і важна, пра што.

«Агонь гарэў недалёка ад студні з новым сасновым зрубам. Студню правілі, відаць, зусім нядаўна. На двары пахла яшчэ смалой, ля зруба не абтаптаўся жвір — яго было высока насыпана, і ён разносіўся нагамі па ўсім двары».

«Ад лесу відаць была добра ўся Лонва — стаяла на шырокіх і цвёрдых тут грудзях зямлі; здавалася, яе нішто не можа зрушыць з пагор'я і сапхнуць да ракі, дзе ніжэй, дзе лог і балота; здавалася, яна тут прырасла навек да зямлі, і зямля без яе — не зямля, і лес без яе — не лес».

Яго апісанні прыроды можна цытаваць і захапляцца імі да бясконцасці.

Яшчэ «Лонва» — адзін з лепшых у беларускай літаратуры твораў пра каханне, хаця там на 250 старонках няма ніводнага пацалунка.

Галоўнаму герою, таксатару Завішняку, 25 гадоў, яго практыкантцы і патаемнай каханай (той самай Жэньцы-Чарнушцы) максімум 16: першы курс тэхнікума пасля сямігодкі.

«Яна яшчэ дзіця, хоць і студэнтка, дзіця, і недзе зусім лёгенькая…»

Завішняк кватаруе ў адзінокай Грасыльды, Жэнька з сакурсніцай Светай — у суседняй хаце, праз вуліцу. Да таго ж удзень яны ўвесь час разам — мераюць лес на дзялянкі. І гэтая іх блізкасць трымае сюжэт, напаўняе аповесць шчымлівым, празрыстым, жнівеньскім святлом.

«Узяць ды ўскудлачыць яе густыя валасы, якія яна расчэсвае ў лесе, кожны раз, калі можна. Яна любіць іх. Але яна не ведае, што яны пахнуць…».

Нейк пад настрой я цытаваў яму цэлыя кавалкі аповесці, называў імёны і прозвішчы: Чаркашына, Грасыльду, Парыпана, Акцызніка… Іван Мікалаевіч слухаў — не слухаў, а плыў — з асалодаю, з падзякаю, з адабрэннем кожнага слова, нібы гэта не ён напісаў, а слухае чыёсь чужое, усклікваў:

— Так, так… Быў такі! Ох, цікавы чалавек!.. — пацяскаў мне плячо, нават адвярнуўся і нібы няўзнак выцер вочы.

Я сказаў, што малым быў закаханы ў яго гераіню, толькі не ў ідэйную, строгую і чыстую Жэньку-Чарнушку, а ў маральна-няўстойлівую, даступную бялявую Светку.

— О-о, — адабраючы мой густ, ажывіўся ён яшчэ больш, вочы заззялі; ён нібы ўспомніў пра свавольніцу Светку нешта такое, аб чым не напісаў. — О-о, Светка!..

«Палымянскі» кабінет выходзіў на шумную вуліцу Захарава. Ад метро ў Лінгвістычны ўніверсітэт і назад ішлі дзяўчаты, мільгалі твары і тварыкі, ногі і ножкі. Іван Мікалаевіч глядзеў, потым адрываўся ад вакна, крактаў і казаў па-руску ўсяго адно слова:

— Весьма!

Да 1990 года я ведаў яго толькі па фотаздымках. Адкрыты лоб, прыгожыя вочы і нечакана тонкія вусны — рэдкасць для вясковага чалавека, прыкмета ганарыстасці, нават пагарды.

Вясной 1990-га, калі мяне яшчэ студэнтам узялі на працу ў «Полымя» і я яго ўпершыню пабачыў, яму было 58 гадоў, і вусны ўжо былі не такія, як на фота, а звычайныя. Байкавая кашуля ў сінія клеткі (сам ён казаў і пісаў толькі «рубашка»), запраўленая ў штаны пад вузкую, зусім вясковую папружку. Сандалі. Белая кепка. Высокага росту, мажны, нетаропкі, знешне крыху нагадвае Янку Брыля. Характарам яны таксама былі падобныя: насцярожанасць спачатку і раскрыццё аж да абдымкаў — потым. Абодвух іх я крыху пабойваўся, ведаючы гэты тып разумных, назіральных, з'едлівых вясковых дзядзькаў. Цяпер, калі сам у іхніх гадах, разумею, што яны так проста абараняліся. Ранімыя, малапрактычныя, сарамлівыя (дарэчы, апошняе ўласціва не толькі Брылю і Пташнікаву, а ўсім без выключэння беларускім пісьменнікам той пары, бо зноў-такі па вясковых мерках што за занятак для здаровага мужчыны — пісаць на паперы літары?).

— Сумна? А я вось трыццаць гадоў тут! Ай-я-яй. Такая вясна на вуліцы, такое жыццё за вакном. Уяўляю, як маладому чалавеку тут сядзець, — і, узяўшы лірычны тон: — Эх, мне б вашыя гады… Пайшоў бы пехам куды вочы глядзяць, па вёсках…

— Прынясі што-небудзь сваё, цікава, як цяпер маладыя пішуць.

Я прынёс недапрацаваную, амаль чарнавік, аповесць «Сінія кветкі».

Іван Мікалаевіч сумленна, з алоўкам, прачытаў дзве старонкі. Узяў чысты аркуш паперы і паклаў побач на стол.

— Не, так не пойдзе. Уяві, што мы блізкія сябры. Сядзім, бутэлька паміж намі, і ты мне расказваеш. Што ты хочаш мне сказаць?

— Ну, хачу сказаць, што… герой з самай раніцы, пакуль мыўся, чысціў зубы, снедаў, не мог адагнаць ад сябе ўспаміну — як ён некалі, маленькі, уцякаў па свежай пакошы ад чмяля і наляцеў на кінутую касу…

Пташнікаў хутка, слова ў слова, запісаў.

— Кінутую касу. Далей.

— …Добра, што быў босы і не мог бегчы на ўсю сілу, а то застаўся б без ног, а тады ж толькі лёгка парэзаўся…

— Парэзаўся. Ёсць.

— …Ён спрабаваў думаць пра штосьці іншае, а ўяўленне ўсё вяртала яго ў той дзень, дамалёўвала тое, чаго не адбылося: як з усяго разгону ён налятае на тонкае лязо, як падрэзваюцца сухажыллі, як палатно амаль перасякае тонкія косці, свішча, залівае ўсё вакол кроў…

— Кроў. Гатова. На! — падаў мне аркушык. — Бачыш — што размазвалася на тры старонкі, можна перадаць трыма нармальнымі сказамі. І далей так пішы: уяўляй, што перад табой самы блізкі чалавек, паміж вамі пачатая пляшка гарэлкі, і ты яму простымі словамі, ціха, няспешна, натуральна расказваеш. Можна нават прагаворваць услых. Сам здзівішся, колькі лішняга слоўнага шалупіння адляціць. — І адразу ж: — Ты скупа пішаш, надта шчыльна, няма дзе алоўку пагуляць. Калі многа тэксту, дык яно і рэдагуецца лягчэй: чык, чык. — Азірнуўся і шапнуў на вуха: — Пакуль я тут, карыстайся момантам. Перадам, што змагу, павучу…

Нават яму, які раскашаваў у беларускай мове, як рыба ў вадзе, часам рабілася ў ёй цесна. Нейк прыйшоў у кабінет, пастаяў і з прыкрасцю прамовіў: «Какой бедный белорусский язык!..» Усе, хто быў у кабінеце, каго раздражнялі яго «драстуйце, відзеў, тапор, скромненька, адуванчык, стул», са зларадствам пераглянуліся — даўно было вырашана, што ён ні многа ні мала не любіць мову. А між тым гэта было сказана менавіта ад празмернай любові. Толькі пасрэдны пісьменнік можа быць цалкам задаволены лексіконам тлумачальнага слоўніка.

Не хапала рафінаванай літаратурнай мовы Мележу. Як ён сам прызнаваўся, «Людзі на балоце» ажылі, задыхалі толькі тады, калі ён пачаў пісаць дыялогі на палескай гаворцы.

Уладзімір Набокаў, гэты чарадзей-лінгвіст, параўноўваючы англійскую і родную рускую, адзываўся зусім не на карысць апошняй, казаў пра яе — «зялёная», называў «не зусім адукаваным, а часам і даволі безгустоўным юнаком».

Сам Іван Пташнікаў быў абсалютным рэкардсменам у беларускай літаратуры па ўжыванні дыялектаў. Калі б іх усе сабраць, атрымаўся б ладны томік. З гонарам расказваў, як яму даводзілася іх адстойваць: «Дамашэвіч усё пагражаў — я вашы плешчаніцкія дыялектызмы і барысаўскія русізмы буду высякаць гэтым вашым «тапаром»»!

Цікава, што ўжываючы мноства ўласных, часта незразумелых нават з кантэксту слоў (што такое ляжэйка, гавыла, глытаўка, дарожніца, дзярнак, додніца? што такое дугаць, гломзаць, ажаргаць, ацілягвацца, выцыўкаць і інш, і інш.?), сам Іван Мікалаевіч быў нецярпімы да дыялектызмаў чужых.

У нас на Мазырскім Палессі ў сакавіку з бяроз «ставяць квас». Іван Мікалаевіч круціў і так, і гэтак, вымаўляў услых, спрабаваў на смак — і такі прымусіў зрабіць унізе старонкі зноску: «ставіць квас» — «спускаць сок».

Пра чалавека, які схуднеў, у нас казалі «высах у цёску». Цёска — вельмі тонкая лучынка. (Дарэчы, ёсць жа ў беларускай мове цясак.). Тое самае — унізе з'явілася зноска: «цёска» — «трэска». Я не змог яму даказаць, што гэта крыху розныя словы.

У мяне было: «мала дзе ён за жыццё папападаў».

— Не, тры па — занадта, — сказаў Іван Мікалаевіч і адно выкрэсліў. — Далей, ты пішаш «басанож». А ў вас як казалі?

— Босы.

— Дык так і пішы. Не басанож, а босы, не аголены, а голы. Далей. У вас хіба казалі мезенец?

— Не, пальчык.

— Бачыш, табе і вучыцца не трэба, проста ўспамінай жывую мову, уяўляй, як бы гэта вымавіў вясковы чалавек.

«Каменьку» паправіў на «кавеньку». Тут я ўжо ўзбунтаваўся:

— Не было ў нас ніякіх кавенек, толькі каменькі. І камяня — тое, што ў слоўніках качарга ці чапяла. А куток каля печы, куды ставілася гэтыя вілачнікі,

ёмачнікі, венікі, — па-нашаму не чалеснік, а камешнік.

Гэта не ўратавала мяне ад зноскі: «каменька» — «кавенька»...

Самае пагардлівае яго выказванне пра літаратурны твор было — узровень «Чырвонай змены».

— Баюся разгортваць цяперашнюю кніжку, не магу прачытаць адзін абзац, нават адзін сказ, нават адно словаспалучэнне. Гэта не беларуская мова і не беларуская літаратура; яна можа існаваць, але называць яе літаратурай, ды беларускай... ВыхОдныя, ЧЭцверы, пятнІцы, ніткаў, вусаў, курЫцаў, нОчыў...

Пішуць — штаніна, а па-беларуску гэта калоша, калашына, пішуць шырынка, а трэба — крэсла... Лайном заўсёды была маленькая пасцілка, а ў што гэтае слова цяпер ператварылі? Зліваюць разам «напрыканцы», а чаму? Чым кепска — на канцы, пры канцы, а яшчэ лепш — у канцы? Што такое «падчас» злітна? Узровень «Чырвонай змены». Пачытай любога нармальнага пісьменніка да 1991 года — у яго будзе толькі «ў час».

— Мова развіваецца, Іван Мікалаевіч.

— Бачу, як яна развіваецца...

Чамусьці вельмі не любіў слова «ёмка» ў значэнні «зручна».

— Ёмка тое, чым патэльню бяруць. І больш нічога. А дзяржак для ёмкі — ёмачнік.

Казаў, што ў нашых слоўніках многа неапраўдана падвойных слоў, напрыклад, казлабароднік, дзядоўнік, а людзі кажуць — казлы, дзяды. Або пустазелле, а ў народзе яно — проста зелле.

— Прычым наша зелле — зусім не рускае «зелье». Нядаўна чуў верш: «Дзе ж мне нарваць таго зелля, каб загаіліся раны?» — пішуць, а не ведаюць, што нашым зеллем раны не гояць, яно ідзе кабанам у карыта.

Памаўчаў і падвёў рысу:

— Вось тое, чым мы, пісьменнікі, у рэдакцыях займаемся, гэта і ёсць развіццё мовы. У народзе яна даўно не развіваецца. Мы ж яе абсмоктваем, пераплаўляем, правяраем на зуб...

Калі ж удавалася яму дагадзіць — радаваўся больш, чым свайму ўласнаму. Знайшоў у мяне слова «чарствы», наставіў плюсікаў, усё дапытваўся: знарок так напісана ці памылкова? — можа, хацеў напісаць «чэрствы»? За адно гэтае слова ён гатовы быў дараваць 150 старонак слабых. Увогуле, ён адзін з усёй Беларусі ацаніў і пахваліў назву маёй аповесці — «Вёска»; яму нават у галаву не прыйшло шукаць тут нешта «бунінскае», ён проста ўслухоўваўся ў гучанне, толькі гэта яго цікавіла, як прозвішча Варум.

Пасля «Вёскі» ён часцей пачаў заходзіць у наш кабінет, даўжэй затрымліваўся. Гаварылі пра пісьменнікаў. Ён хваліў Адамчыка, вельмі цёпла адзываўся пра Караткевіча, з якім жылі на адной лесвічнай пляцоўцы, прыносіў, нібыта каб паказаць, які ў «Валодзькі» почырк, кніжку, падпісаную: «Івану Пташніку, самаму лепшаму сябру, дарагому брату...». (Іван Мікалаевіч ніколі не расказваў і нідзе не пісаў, адкуль узялося «аў» на канцы яго прозвішча.).

Успамінаў Мележа. Калі ў «Полымі» друкаваліся «Людзі на балоце», у аддзеле прозы



І. Пташнікаў, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, В. Адамчык, Б. Сачанка, стаяць В. Каваленка і А Вярцінскі

акрамя Пташнікава працавалі Янка Сіпакоў і Барыс Сачанка. Рэдагаванне Мележа яны называлі «гладзіць кракадзіла». Ён вельмі хваравіта ставіўся да любой заўвагі, нават да коскі. Здаецца, усё зразумела, а ён — «я падумаю, добра, забяру рукапіс дамоў і падумаю». Першае, што казаў, заходзячы ў кабінет: «Ёсць заўвагі? — «Няма, Іван Паўлавіч». — «А гэта што?» — упіваўся вачыма ў рэдкую, адну на пяць старонак, птушачку.

Барыс Сачанка, якому як земляку часцей за іншых выпадала ўлагоджваць «кракадзіла», адказаў: «Вы напісалі «пожня», але пожня — калі зжата, а калі скошана, у нас казалі — «пакоша».

Мележ прысеў, абхапіў галаву рукамі і застыў, нібы здарылася з ім вялікае гора. Потым ціха, пераселым голасам сказаў:

— І ў нас пакоша...

Ён баяўся, што можа забыць жывую мову, перажываў, як гэта ён, па 20 разоў перапісваючы, мог прапусціць хоць косачку. Але ніколі, нават калі была яго праўда, не спрачаўся, забіраў рукапіс дамоў і часцей за ўсё рабіў так, як хацелася рэдактару.

— Пра што вы яшчэ гаварылі? — дапытваўся я.

— Ды пра тое самае, што і мы цяпер — пра мову.

Мележ казаў, што вось пачалі пісаць лужок замест полава, чашка замест кубка. «Усё гэта, можа, драбяза, памылкі, але ж яны фіксуюцца, уводзяцца ў слоўнікі як норма». Наракаў, што сталася з нашымі беларускімі імёнамі, як яны калечацца, а гэта ж таксама наш скарб. Калі людзей усё жыццё звалі Алена і Прахор, то ў чыю галаву прыйшло, што трэба зваць іх Алёна і Прохар? Пайшлі раптам Ялізаветы, Якацярыны, Анатоліі, Юліі, з падвоенымі зычнымі Таццяна, Наталля, Уллянна, Анастасія...

Я ўспомніў, што ў самога Пташнікава гераіню завуць Настасея.

— Цяпер бы напісалі Настасья, з разанскай інтанацыяй.

— Але, — згадзіўся Пташнікаў. І раптам ціха заспяваў: — Эх, Настасья, эх, Настасья, отворяй-ка ворота!..

У яго быў прыемны голас і бездакорны музычны слых — такі ж, як і літаратурны.

Наколькі адкрыты ён быў са «сваімі», настолькі ж зацінаўся, хаваўся ў панцыр з «чужымі». Анатоль Сідарэвіч успамінаў: «Іван Мікалаевіч быў вельмі цікавы чалавек, але нешта было ў ім таямнічае, ён не адкрываўся цалкам, нешта не дагаворваў, прыхоўваў. Пазбягаў публічнасці. Яго нельга было «раскруціць» на інтэрв'ю».

Сам ён нават як бы хваліўся гэтым:

— За ўсё жыццё, — казаў ён, — не даў ніводнага інтэрв'ю і ні разу не выступіў перад чытачамі!

Яго звышсціпласць, ці, як гэта назваць, даходзіла да таго, што ён не з'явіўся на ўласны 70-гадовы юбілей. Вечарыну ў Доме літаратара вёў паэт Мікола Мятліцкі, на сцэне вісеў патрэт юбіляра, на століку ў вазе сталі кветкі, а дзе быў у гэты час юбіляр і што думаў — невядома.

Аднойчы сказаў з лёгкім дакорам:

— Чаму вы так нясмела пішаце, маладыя? Вам жа ўсё можна, вы ж не мы, каго запалохалі ад пачатку і да канца жыцця.

Калі на маё апавяданне «Бляха», якое яму падабалася, выйшла ў «ЛіМе» нейкая несур'ёзная нават па тых часах, тым больш па цяперашніх, крытыка, ён убег у кабінет з газетаю ў руцэ, узрушаны, устрывожаны:

— Не папускайце! Бо прывыкнуць! Пішыце адказ! Абараняйцеся!

Я нагадаў яму чэхаўскае: нельга пісаць абвяржэнні на крытыку; нават калі пачнуць сцвярджаць, што ты робіш фальшывыя грошы, і тады нельга абвяргаць; адзіны выпадак, калі можна пісаць абвяржэнне, — калі трэба заступіцца за каго-небудзь.

— Ага. А Чэхаву даводзілася абвяргаць не крытыку, а пахвальбу?

— Як гэта?

— Мой «Тартак» расхвальвалі на радыё «Свабода», Станіслаў Станкевіч, а я вымушаны быў гэта абвяргаць. Пісаў у «Голас Радзімы» ліст...

І ўсё ж думаю, што не толькі запалохалі, не адна асцярожнасць была прычынай яго дзіўнаватага, дзікаватага адзіноцтва. Надта самадастатковай была яго проза. Цану сабе ён ведаў. Магчыма, ён проста не хацеў пускаць у свой свет чужых. Бо ўсё ж сказана ў творы. І раскладзена па палічках у рэцэнзіях. Калі чалавек не чытаў, ці прачытаў і не зразумеў, дык якія выступленні, якія інтэрв'ю могуць яго змяніць? Гэта проста не мой, не Пташнікава, чытач. Хай чытае іншых.

Да таго ж і нашы чытачы не заўсёды Алёшы Карамазавы. Калі б не хвароба, не ўзрост, калі ўявіць Івана Мікалаевіча за камп'ютарам — ён мог бы прачытаць пра сябе і такое: «Пасля аднаго сказа Пташнікава больш я ні яго, ні вясковую прозу чытаць не буду, я яе ненавіджу!»; або: «Ці мае Пташнікаў сёння чытачоў і прыхільнікаў, ды і ўвогуле колькі чалавек са 100 апытаных каля ўвахода ў БДУ прызнаюцца, што чулі пра такога?»

Гэта пісалася пры яго жыцці.

У душы ён, канечне, хацеў славы — але такой, якая прыйшла б без усялякіх намаганняў з яго боку, сама сабой ці з дапамогаю ўладаў. Адзін з самых любімых пісьменнікаў Пятра Машэрава, калі не самы любімы, ён да канца жыцця спадзяваўся на цуд: напрыклад, атрымаць званне «народнага», або — яшчэ вышэй — наіўна верыў у нейкую «літаратурную справядлівасць», скажам, у шведскую інстанцыю, якая нібыта тым і займаецца, што вышуквае ў глухіх кутках геніяльных, але сціплых творцаў і выцягвае іх на свет Божы.

Пасля 2002 года яго кумірам стаў нікому раней невядомы Імрэ Картэс.

«Паглядзіце на гэтага венгерца, — узбуджана казаў мне па тэлефоне. — Вайна, разруха, а ён піша сабе ў падвале (так Івану Мікалаевічу ўяўлялася). І вось, у аднначассе, сусветнае прызнанне! І так не прападзе ніякі талент, ні пры якіх умовах!»

Па голасе адчувалася, што ён крышку і сябе падстаўляе на месца Картэса.

З гадамі ён пісаў усё лепш. «Львы», «Пагоня», «Арчыбал», «Францужанкі»... І самая апошняя, у 70 гадоў, шэдэўр аўтабіяграфічнай прозы — «Ненапісаная аповесць». Але такіх рэчаў ужо не было каму чытаць, а калі і былі такія, іх словы ўжо нічога не значылі. Пік беларускага літаратурнага адраджэння мінуў, слова «талент» выпала з ужытку, літаратура пачала брацца ў двукоссі і замяняцца «літпраектам», запанавала, як эпідэмія, татальная малапісьменнасць і проста непісьменнасць, няглядзячы на штаты карэктараў і рэдактараў. Плюс вакол яго імені не было легенды. Калі не лічыць містыфікацый з інтэрв'ю і выступленнямі, усё ў яго ішло неяк занадта роўна, гладка, правільна. Ён не быў «прарокам», «апосталам нацыі» (а ў нас ад пісьменніка патрабуюць чамусьці толькі гэтага); тое, што ён самародак, непераўзыдзены мастак, ужо мала каго цікавіла.

Ён сам гэта адчуваў. Прыкладна з 2000 года добрахвотная самаізаляцыя пачала яму крыху надакучваць. Ён нават выступіў на філфаку БДУ. Пра тое выступленне ён, радасны, амаль шчаслівы, расказваў: «Чалавек 200! Поўная зала! Ды ўсе такія маладыя, прыгожыя, ды разумныя, ды ўсе па-беларуску, ды такія цікавыя пытанні... Адзін вельмі сімпатычны хлопец пытае: «За каго вы галасавалі?» — «За Лукашэнку, — адказваю. — І сам, і ўсю сям'ю пераканаў». Мёртвае маўчанне двухсот чалавек. Потым у цішыні дзявочы голас: «А чаму?» Я вінавата развёў рукі: — «Вось цяпер я і думаю, чаму...» У сэнсе, што я, стары дурань, нарабіў. Тут раптам — апладысменты, авацыя!..»

Усё часцей ад яго можна было пачуць, што ён не заўважыў, як прайшло жыццё, што з-за вечнай вясковай асцярожнасці, сціпласці ён так мала ад яго ўзяў.

— Эх, каб можна было вярнуць... Хоць бы даў сабе волю, хоць бы піў, курыў, нават распуснічаў бы... А так — ну проста няма чаго ўспомніць!

— Усё жыццё адчуванне, што я падманваю людзей, калі яны называюць мяне на вы і па-бацьку, бо які я Іван Мікалаевіч? Я быў і ёсць шасцігадовы Іванко...

Калі інтэрнэт прынёс вестку пра яго смерць, першае, што ўспомнілася, — мост праз Свіслач, на якім ён абдымаў мяне і ўпрошваў не ісці на мітынг; успомнілася, як некалі расказваў, што ў блакаду піў ваду, выціснутую з балотнага моху, і то была «самая смачная ў свеце вада, халодная і кісленькая, з чорнымі макаўкамі». А потым памяць перанесла яшчэ далей, у 1990 год, у самую першую нашу сустрэчу. Чужы кабінет, поўны незнаёмых людзей. Я глядзеў на яго і думаў: які ж ён строгі, суровы з выгляду, які гэта, відаць, бязлітасны, жорсткі рэдактар... Чым яго ўзяць? Як да яго падступіцца? Веснавы ветрык надзімаў фіранкі; каля расчыненага вакна на скразнячку сядзеў нейкі правінцыйны аўтар у вышытай сарочцы і гучна расказваў, як летась, праз тры гады пасля Чарнобыля, у сваёй вёсцы пад Ельскам стаў сведкам крыху вусцішнай з'явы: вялікага рушэння гадаў і земнаводных, яшчарак, чарапах, вожыкаў, мышэй, жаб; усё паўзло, скакала, шчамілася з рэчкі, з поля, з лесу ў двары да людзей, да чыстай калодзежнай вады. Асабліва многа было гадзюк, ды ўсе нейкія рознакаляровыя: шэрыя, чорныя, карычневыя, з узорамі на спінах і без узораў. Страшна было босаму і без дубца выйсці на двор. Куры, пабачыўшы гадзюку, збіваліся ў кучу, сакаталі, выцягвалі шыі, а певень адганяў яе дзюбаю. «І вось, — расказваў аўтар, — на адну я, босы, каля самага ганка, умудрыўся наступіць!» Яна грэлася на сонцы, ці спала, і не ўкусіла толькі таму, што была наетая, — пасярэдзіне было патаўшчэнне, як курынае яйка. Не так ад страху, колькі ад злосці ён знайшоў дубца і засек яе на месцы.

Пташнікава аж перасмыкнула. Ён неяк па-дзіцячы выставіў перад сабой далонь і ўскрыкнуў:

— Нашто? Не трэба!..

І ад усёй яго нібыта суровасці не засталося і следу. Першы раз у жыцці я бачыў чалавека, які шкадуе нават гадзюку.

2017 г.

Самы высокааплатны пісьменнік — жанчына

Часопіс «Forbes» склаў спіс самых высокааплатных пісьменнікаў за 2017 год. Рэйтынг, які будзе цалкам апублікаваны ў вераснёўскім нумары, часткова даступны на сайце выдання.



Узначаліла пералік брытанская пісьменніца Джоан Роўлінг, аўтар патэрыяны. Яна зарабіла 95 мільёнаў даляраў за апошнія 12 месяцаў. Дж. Роўлінг вярнулася на першы радок упершыню з 2008 года.

У рэйтынгу з'явілася яшчэ адна жанчына — брытанка Пола Хокінс, якая стала вядомая дзякуючы раману «Дзяўчына ў цягніку», які быў экранізаваны.

У той жа час з «багатага» спісу зніклі імёны амерыканскага фантаста Джорджа Марціна, чый цыкл кніг «Песня лёду і полымя» лёг у аснову серыяла «Гульня стальцоў», а таксама Джона Грына, аўтара кніг «Вінаватыя зоркі», «У пошуках Аляскі» і «Папяровыя гарады».

Як адзначаюць складальнікі рэйтынгу, творы пяці з топ-11 пісьменнікаў былі экранізаваныя, але асноўную частку заробку ім прынеслі продажы менавіта кніг. Разам гэтыя 11 аўтараў прадалі больш за 30 мільёнаў копій у ЗША за год і атрымалі 312 мільёнаў даляраў.

Букераўская прэмія-2017

Штогадовая міжнародная прэмія адзначае лепшы мастацкі літаратурны твор, перакладзены на ангельскую мову.



Сёлета пераможцам стала кніга Давіда Гросмана «A Horse Walks Into a Bar» («Конь заходзіць у бар»). Пісьменнік разам з перакладчыкам Джэсікай Коэн атрымалі кожны па 50 тысячаў фунтаў стэрлінгаў, і яшчэ па тысячы фунтаў за тое, што патрапілі ў кароткі спіс прэміі.

Давід Гросман — ізраільскі пісьменнік, які піша мастацкія творы, нон-фікшн, а таксама дзіцячыя кнігі. Тэксты аўтара былі перакладзены на 36 моў. Гросман з'яўляецца лаўрэатам шматлікіх міжнародных прэмій, і не толькі па літаратуры.

Джэсіка Коэн — перакладчыца, нарадзілася ў Брытаніі, але расла ў Іерусаліме. Раней яна пераклала кнігу Д. Гросмана «To the End of the Land». Акрамя таго, на рахунку Дж. Коэн пераклады на ангельскую мову іншых вядомых ізраільскіх пісьменнікаў.

«The Guardian» так напісала пра кнігу «Конь заходзіць у бар»:


«Гэта не проста кніга пра Ізраіль: гэта кніга пра людзей і грамадства, якія перажылі жудасны збой. Часам мы ўспрымаем гэтыя рэчы толькі праз гісторыю — і Гросман, як і галоўны герой яго працы, стаў майстрам праўдзівай аповесці».

Перакладчыца кнігі лаўрэата міжнароднай Букераўскай прэміі Давіда Гросмана Джэсіка Коэн паведаміла, што пералічыць палову належнага ёй грашовага ганарара арганізацыі «Бецэлем» — ізраільскай некамерцыйнай установе, якая займаецца зборам інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека на акупаваных і анэксаваных Ізраілем тэрыторыях (Усходні Іерусалім, Галанскіх вышынях, Заходнім беразе ракі Іярдан і Сектары Газа) ды пра аналагічныя парушэнні на тэрыторыі Ізраіля).

155 гадоў гісторыі Алісы ў Краіне цудаў

4 ліпеня 1862 года падчас катання на лодцы па Тэмзе і летняга пікніка выкладчык матэматыкі з Оксфарда Чарльз Лютвідж Доджсан прыдумаў і адразу ж расказаў дочкам віцэ-канцлера Оксфардскага ўніверсітэта гісторыю пра неверагодныя прыгоды дзяўчынкі, якая пабегла за белым трусам і нечакана патрапіла праз Трусіную нару ў падземную Краіну цудаў.

Сёстрам незвычайная казка спадабалася, і яны няспынна патрабавалі яе працягу, а 10-гадовая Аліса папрасіла свайго старэйшага сябра запісаць на паперу аповед пра яе, настойваючы: «І хай там будзе пабольш усякіх глупстваў!»



Ч. Доджсан сеў за рукапіс казачнай гісторыі на наступны ж дзень пасля паездкі і больш падрабязна распрацаваў сюжэт і гісторыю Алісы. Пасля ён адзначаў, што падарожжа ўніз па Трусінай нары насіла імправізацыйны характар і было, па сутнасці, «адчайнай спробай прыдумаць нешта новае». У лістападзе ён ужо больш сур'ёзна заняўся рукапісам, і каб зрабіць гісторыю больш натуральнай, даследаваў паводзіны жывёл, згаданых у кнізе, а таксама зрабіў 38 уласных ілюстрацый да рукапісу.

26 лістапада 1864 года пісьменнік завяршыў працу над першым варыянтам казачнай гісторыі, якая атрымала назву «Прыгоды Алісы пад Зямлёй». Рукапісны сшытак у скуранай вокладцы быў дасланы Алісе Ліддзел з надпісам «Калядны падарунак Дарагому Дзіцяці ў Памяць пра летнія Дні».

А праз тры гады з моманту ўзнікнення гісторыі ў выдавецтве «Macmillan and Co» выйшла першае выданне кнігі «Аліса ў Краіне цудаў» пад імем Льюіса Кэрала (дваіны пераклад імя Чарльза Лютвіджа на латынь і назад на ангельскую) з 42 ілюстрацыямі Джона Тэніела. Але перад тым, як рукапіс быў апублікаваны, аўтар павялічыў аб'ём твора да 27,5 тысяч слоў, дапоўніўшы казку эпізодамі пра Чэшырскага ката і Вар'яцкае чаяванне. Сам Доджсан заяўляў, што поспех яго працы заснаваны на дапамозе двух памочніцаў — феі фантазіі і любові да дзяцей.

«Па Русі з Максімам Горкім»

Як паведаміла прэс-служба адміністрацыі Ніжняга Ноўгарада, распрацоўваецца літаратурны турыстычны маршрут па месцах Максіма Горкага.



Першы турыстычны маршрут «Па Русі з Максімам Горкім» пачнецца ўжо восенню. Раней Дзяржаўным музеем А. М. Горкага быў атрыманы прэзідэнцкі грант у памеры мільёна расійскіх рублёў на рэалізацыю музейна-турыстычнага праекта.

Прапанова ніжагародцаў аб стварэнні музейна-турыстычнага маршрута па біяграфіі пісьменніка ўхваліла Міністэрства культуры Расіі на пасяджэнні аргкамітэта па падрыхтоўцы святкавання 150-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, якое будзе адзначацца ў наступным годзе. Цяпер ідзе актыўная праца з тураператарамі і музеямі гарадоў Расіі, якія ўвойдуць у маршрут.

Галоўную ідэю праекта складае «вандраванне па біяграфіі» вядомага ніжагародскага пісьменніка, знаёмства з яго творчай спадчынай, асяроддзем, якое паўплывала на станаўленне характару Аляксея Пешкава і творчага стылю Максіма Горкага. У маршрут уваходзяць аглядная экскурсія, дзве тэматычныя экскурсіі на выбар і тэматычная культурная праграма літаратурна-тэатральнай накіраванасці па чатырох гарадах: Маскве, Ніжнім Ноўгарадзе, Казані і Арзамасе. Агульны кошт рэалізацыі праекта — 1,9 мільёнаў расійскіх рублёў, з якіх за 1 мільён — згаданы грант прэзідэнта Расіі, а астатняя частка выдаткоўваецца са сродкаў гарадскога бюджэта.

Прабачэнне за Салжаніцына

30-га чэрвеня 1989 года Саюз пісьменнікаў СССР афіцыйна прызнаў, што ў 1974-м была здзейсненая памылка, калі Аляксандра Салжаніцына выключылі з арганізацыі. Рашэнне было адменена.

Што ж адбылося за пятнаццаць гадоў да публічнага прабачэння? Незадоўга да гэтага ў Парыжы быў апублікаваны першы том «Архіпелагу ГУЛАГ». А. Салжаніцына выслалі з Савецкага Саюза. З гэтага моманту пачаўся эміграцыйны перыяд біяграфіі пісьменніка, які працягнуўся да 1994 года.

На наступны дзень пасля дэпартацыі пісьменніка загадам начальніка Галоўнага ўпраўлення па ахове дзяржаўных таямніц у друку пры Савеце міністраў СССР было абвешчана «аб канфіскацыі з бібліятэк і кнігагандлёвай сеткі твораў Салжаніцына А. І.». Знішчаліся нумары «Новага мира» з апавяданнямі апальнага празаіка. Знішчаўся надрукаваны першы нумар часопіса «Роман-газеты» за 1963 год з «Адным днём Івана Дзянісавіча», а таксама выданні для сляпых «Учпедгиз» і пераклады на эстонскую і літоўскую мовы.

Вайна з класікамі?

Як паведаміў старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута рускай літаратуры РАН Аляксей Балакін, у бібліятэкі Архангельскай вобласці паступіла сакрэтнае распараджэнне прыбраць з паліц кнігі, атрыманыя ў межах праграмы «Сельская бібліятэка» Інстытута «Адкрытае грамадства».

«Да асобага распараджэння» ў бакоўку складваюць кнігі Пушкіна і Дастаеўскага, Чэхава і Прышвіна, Салжаніцына і Астаф'ева, Чукоўскага і Кэрала, Лотмана і Пуцілава, кнігі выдавецтваў «Росмэн» і «Тэра», «Азбука» і «Маладая гвардыя», кнігі серый «Школьная бібліятэка» і «Жыццё выдатных людзей», ілюстраваныя дзіцячыя энцыклапедыі «Аванта+» і філасофскія працы, мемуары і шэдэўры сусветнай паэзіі.

Па словах А. Балакіна, бібліятэкарам сказалі, што кнігі выдадзеныя забароненай у Расіі арганізацыяй. Як патлумачыў А. Балакін, насамрэч інстытут «Адкрытае грамадства», які належыць Фонду Сораса, купляў іх у іншых выдавецтваў, а потым рассылаў у сельскія бібліятэкі. На гэтых кнігах стаіць штамп арганізацыі. Паводле інфармацыі крыніцы «Радыё Свабода», «іх масава прывозілі да нас у пачатку 2000-х, потым размяркоўвалі па ўсіх бібліятэках». Распараджэнне «адбіраць» кнігі прыйшло з міністэрства культуры Архангельскай вобласці. Супрацоўніца бібліятэкі дадала: «У спіс рэкамендаваных да канфіскацыі патрапілі Пушкін, Дастаеўскі, Чэхаў, Талстой, вельмі шмат дзіцячай літаратуры, нават Карней Чукоўскі. Да нас школьнікі прыходзяць цяпер са спісамі літаратуры, рэкамендаванай да чытання на лета, а мы ім іх не выдаём»...

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by